№ 25 (575) 10 ліпеня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі



## Вінаватым аказаўся Шэйман

Лукашэнка скарыстаў з выбуху 4 ліпеня ў сваіх мэтах.

Старонка 2

## Над безданьню ў ілжы

Першую бомбу знайшлі за дзьве гадзіны да выбуху, але канцэрт не спынялі, каб не псаваць сьвята.

Старонка 2

## Qui prodest?

«Каму выгадна?» Вэрсіі аналізуе Юры Дракахруст.

Старонка 5




Рэнтген нагі аднаго з пацярпелых ад выбуху 4 ліпеня. Бомба была начыненая балтамі й гайкамі.

# Віцебскі сьлед

Нават людзям далёкім ад крыміналістыкі кінуліся ў вочы падабенствы выбухаў на сьвяточным канцэрце зь віцебскімі 2005 году. Піша **Андрэй Дынько**.

I там і там самапальныя зарады. Пэўныя дэталі вырабу бомбаў і іх разьмяшчэньня сярод людзей супадаюць. I там і там выбух прыпадае на пачатак передвыбарнай кампаніі. Нават колькасьць параненых амаль роўная — там 40, тут 50. I ніводнае сьмяротнае ахвяры. Не было ў Беларусі ад 1953 году аналягічных тэрактаў. Магчыма, гэта справа рук аднаго чалавека.

Паводле інфармацыі «Ежедневника», сьледчыя таксама цяпер разглядаюць «віцебскі сьлед» як асноўны.

Зьвярніце ўвагу: тым часам выказваньні А.Лукашэнкі і ягоных СМІ былі ад пачатку процілеглымі. Ні разу яны не акцэнтавалі параллелу трагічнага здарэньня ў Менску зь віцебскімі. Ні разу публічна не зачапіліся: а што мы мелі там?

Зьлёту запусьцілі вэрсіі пра «хуліганства» і — настойліва — пра магчымую сувязь з выбухамі «экстрэмісцкіх элемэнтаў апазыцыі». Хоць ні для першага, ні для другога не было ніякіх фактычных падставаў.

Далей — болей.

### I вы гэтых людзей ведаеце ў твар

«I ніякія правакацыі нікому не дапамогуць, нават калі камусьці гэтае сьвята не падабаецца — а ў нашай краіне ёсьць людзі, якім яно не падабаецца, і вы гэтых людзей ведаеце ў твар, — сказаў А.Лукашэнка. — Разьбірацца будзем па законе: няважна хто — лідэр, ня лідэр, значная фігура для Захаду, Усходу ці ўнутры краіны. Думаю, гэта гнюсныя, баязьлівыя людзі... Хочаце ваяваць — рабіце гэта лоб у лоб. Цяпер мы будзем размаўляць зь імі іншай мовай».

Прасьцей ня скажаш. I, даруйце, крывей ня скажаш. Ужо ж не віцебскага бамбіста аўдыторыя А.Лукашэнкі ведае ў твар.

У сваю чаргу, верныя журналісты разьвілі наступнае:

«Изо дня в день, из года в год оголтелые политики (sic!) и лакействующие журналисты (sic!!) безжалостно травят толерантное белорусское общество. Без устали, энергично и изобретательно одних белорусов науськивают на других, — піша «Советская Белоруссия». — Им, «непримиримым», тысячу и один раз говорилось: не совращайте молодёжь, не воспитывайте штурмовиков, мы — белорусы! — и нам нечего делить! Взрыв на площади в пятницу может считаться зловредными и — к величайшему сожалению! — логическими плодами непрекращающейся пропаганды ненависти». Каб ня выйшла памылкі, каб не падумалі на тых, хто больш не актуальны, газэта падае і сьпісачак тут жа: Калякін, Мілінкевіч, Лябедзька і Івашкевіч.

**Працяг на старонцы 8.**

гІстарычНы сшытак «НН» чэрвень 2008

**Кузьма Казак: «Вайна ў Беларусі выглядала невыносна агіднай»**
З гісторыкам Кузьмом Казаком гутарыць Наталка Бабіна. Старонка 9.

**Калі Полацак стаў Вэнэцыяй?**
Швайцарскі дасьледчык склаў унікальную кнігу пра першую беларускую сталіцу. Піша Алег Дзярновіч. Старонка 10.

**Грамадзянін Вялікага Княства**
Здараецца, што няма каму ўзгадаць героя, бо ён самотны і гіне апошнім. Пра Ігнація Някляўза пішуць Мікола і Ўсевалад Сьцебуракі. Старонка 11.

**Дзень вызваленьня**
Штогод 3 ліпеня, на Дзень вызваленьня Беларусі, дзед Антон езьдзіў на сустрэчу былых партызанаў брыгады «Сьмерць фашызму». Піша Алесь Аркуш. Старонка 12.

**Гісторык Сьмяховіч: «Ніякай Беларуска-літоўскай дзяржавы не існавала».**
Старонка 13.

# Лукашэнка — Шэйману: «Вы вінаватыя»

Адбылося нечуванае: у паліцэйскай дзяржаве тэрарыст(ы) заклаў(лі) выбухоўку на галоўным сьвяце ўладаў.

У краіне нечуванае здарэньне — у ноч на 4 ліпеня ля стэлы «Менск — горад-герой» падчас канцэрту-сьвяткаваньня афіцыйнага Дня незалежнасьці грымнуў выбух. Як потым высьветлілася, спрацавала самаробнае выбуховае прыстасаваньне, начыненае нітамі і гайкамі. Больш за паўсотні чалавек было паранена і шпіталізавана.

Выбух адбыўся каля паловы на першую ночы, калі яшчэ праходзіў канцэрт зорак беларускай і расейскай папсы. Як кажуць сьведкі, выбух быў ня вельмі гучным. Некаторыя ўдзельнікі сьвята, якія знаходзіліся ў пару сотняў мэтраў ад эпіцэнтру, яго нават не пачулі. Канцэрту спыняць ня сталі. Афіцыйнае тлумачэньне — каб не ствараць панікі.

Сярод пацярпелых трое чалавек знаходзяцца ў цяжкім стане, яшчэ некалькі ў стане сярэдняй цяжкасьці. Галоўны доктар Менскай гарадзкой клінічнай бальніцы хуткай дапамогі Віктар Сірэнка абвяргае чуткі пра сьмерць аднаго з пацярпелых. Паводле словаў доктара, у пацярпелых таксама не было адарваных канечнасьцяў.

Сярод ахвяраў выбуху асноўную масу склала моладзь ва ўзросьце ад 18 да 25 гадоў, што праўда, былі дзьве зусім маленькія дзяўчынкі 5 і 6 гадоў. Былі сярод пацярпелых і грамадзяне Расеі і Ўкраіны, пацярпелі і тры міліцыянты.

Дапамогу беларускаму боку адразу прапанавалі Расея і ЗША. У Менску ўжо працуюць прадстаўнікі расейскіх спэцслужбаў, якія маюць досьвед расьсьледаваньня тэрактаў. А.Лукашэнка таксама выказаў удзячнасьць Амэрыцы за прапанаваную дапамогу — у першую чаргу тэхнічную. Кіраўнік дзяржавы аддаў беларускім сілавым ведамствам распараджэньне скарыстаць гэтую дапамогу пры неабходнасьці. «Гэта будзе карысна і з пункту погляду абмену досьведам, кантактаў, і перш за ўсё ў пляне вырашэньня тэхнічных пытаньняў», — цытуюць А.Лукашэнку афіцыйныя крыніцы.

### Адразу ўзьніклі сумневы

Адразу пасьля здарэньня на месца выбуху прыехаў кіраўнік дзяржавы. Гэта выклікала розныя камэнтары і здагадкі: інструкцыі аховы дзяржаўных асобаў строга забараняюць такое. Да таго ж, усе ўзгадалі што ў інтэрвію «Камсамолцы» літаральна за тыдзень да здарэньня А.Лукашэнка прадказваў, што «апазыцыя рыхтуе выбухі і беспарадкі». А.Лукашэнка патлумачыў сваё паводзіны тым, што не паслухаўся засьцярогаў супрацоўнікаў службы бясьпекі, бо была патрэба арганізаваць эвакуацыю людзей.

Між тым МУС паведамляе, што на месцы сьвяткаваньня было знойдзена яшчэ адно выбуховае прыстасаваньне, якое, на шчасьце, не спрацавала. Пазьней дзяржаўныя СМІ распаўсюдзілі навіну, што Лукашэнка сам знаходзіўся ў межах дасягальнасьці выбуху. Няясна, праўда гэта ці піяр. Сам Лукашэнка заявіў, што тэракт ня быў скіраваны супраць яго асабіста.

«Калі б я зрабіў так, як мне раілі, гэта значыць пакінуў месца здарэньня, то арганізатары гэтай гнюснай акцыі дабіліся б сваёй мэты. Яны ж разьлічвалі менавіта на тое, каб пасеяць паніку. Гэтая акцыя была скіраваная супраць мірных людзей», — заявіў Лукашэнка журналістам 5 ліпеня падчас наведваньня гэтак званай «Лініі Сталіна».

Тым часам дзяржаўныя СМІ разгарнулі кампанію з мэтай зьвязаць у сьвядомасьці тэракт з палітычнымі працаўнікамі А.Лукашэнкі. Апазыцыя адразу на гэта зрэагавала.

**Працяг на старонцы 3.**




# Намесьнік міністра: Бомбу сапраўды знайшлі за дзьве гадзіны да выбуху

Выбуховае прыстасаваньне, якое не ўзарвалося, было знойдзена за дзьве гадзіны да выбуху. Пра гэта паведаміў першы намесьнік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі Аляксандар Шчурко ў інтэрвію газэце «Комсомольская правда» в Белоруссии», апублікаваным 9 ліпеня. Такім чынам, пацьвердзіліся зьвесткі ананімнай крыніцы ў сілавых структурах, якая раней дала гэту інфармацыю незалежным СМІ.

Паводле слоў сп.Шчурка, «першае прыстасаваньне было ў два разы большым за тое, што выбухнула», менчукі, якія сьвяткавалі Дзень Незалежнасьці, знайшлі яго прыкладна а 22:30, але не адразу аддалі міліцыянтам.

«Грамадзяне паднялі зь зямлі двухлітровую ўпакоўку з-пад соку. Злачынца скарыстаўся тым, што было пакінута шмат пакетаў з-пад соку, і гэткім чынам замаскіраваў выбуховае прыстасаваньне. Пакет адкрылі і, скажам так, убачылі элемэнты выбуховага прыстасаваньня. Аднесьлі супрацоўнікам міліцыі», — расказаў намесьнік міністра.

Супрацоўнікі міліцыі, паводле слоў спадара Шчурко, паклалі пакет «у бясьпечнае месца».

Прыстасаваньне, якое ўзарвалося празь дзьве гадзіны, таксама знаходзілася ў пакеце з-пад соку, які, паводле слоў Аляксандра Шчурко, быў удвая меншым за першы.

Варта адзначыць, што пра факт знаходжаньня выбухоўкі за дзьве гадзіны да тэракту сп. Шчурко паведаміў толькі пасьля таго як ананімныя сілавікі расказалі пра гэта незалежным СМІ, праз 4 дні пасьля здарэньня. Нагадаем, раней інтэрнэт-газэта afn.by са спасылкай на сваю крыніцу ў праваахоўных органах. Мяркуючы з тэксту — у КДБ.

Паводле яе, першае выбуховае прыстасаваньне — усяго іх было тры — было знойдзенае супрацоўнікамі праваахоўных органаў між 22:30 і 23:00, то бок прыкладна на паўтары гадзіны раней за выбух. Спачатку праваахоўнікі палічылі, што гэта муляж, аднак для перастрахоўкі выклікалі мінёраў. Тыя прызналі, што гаворка ідзе пра сапраўднае выбуховае прыладу.

Варта адзначыць, што мінёры прыбылі на месца тэракту за паўтары гадзіны да выбуху, але знайсьці другую і трэцюю прыладу не ўдалося. Альбо не шукалі, выказвае меркаваньне газэта.

Потым быў выбух, на месца якога і адправіўся Лукашэнка. «Палез у варонку», кажучы ягонымі словамі, а калі больш дакладна, то дабраўся туды на браніраваным джыпе па адмыслова арганізаваным у натоўпе калідоры.

Джып надзейна ахоўваў Лукашэнку ад магчымага наступнага выбуху. Варонка ж на той момант зьяўлялася самым бясьпечным месцам на сьвяточнай пляцоўцы – колькі б там ні было выбуховых прыстасаваньняў, яны б усе спрацавалі ад дэтанацыі падчас выбуху.

Трэцяе прыстасаваньне знайшлі ўжо пасьля таго, як Лукашэнка раздаў указаньні па ліквідацыі наступстваў. Прычым знайшлі зноў-такі выпадкова, ударыўшы нагой пакет з-пад соку, які аказаўся занадта цяжкім. Спрацаваць трэцяя прылада мусіла а 2-й ночы.

Як паведаміла крыніца, усе тры прыстасаваньні мелі таймэр і былі выробленыя на прафэсійным узроўні. Тол быў расплаўлены і заліты ўперамешку з гайкамі і падшыпнікамі ў плястыкавыя бутэлькі ад піва і пакет ад соку, што рэзка памяншала магчымасьць іх знаходжаньня. Чалавек, які іх вырабіў, добра разумеў, што робіць. Гэта пацьвярджае начынка прыстасаваньняў.

У інтэрнэце ўжо неаднакроць выказвалася меркаваньне, што калі б арганізатар тэракту меў на мэце атрымаць як можна больш ахвяраў, то для начынкі выкарыстаў бы цьвікі і самарэзы.

«Той, хто вырабіў бомбы, добра пра гэта ведаў», — сказаў суразмоўца afn.by.

Ён таксама паведаміў, што ўжо дакладна вядома, што выкарыстаны ў прыладах тол ужываецца ў сучасных баявых снарадах і не зьяўляецца «знаходкай» чорных капачоў, якія шукаюць зброю часоў Другой сусьветнай вайны.

Са словаў суразмоўцы, каля месяцу назад КДБ затрымаў былых супрацоўнікаў «Алмазу» (спэцпадразьдзяленьне МУС), у якіх таксама было сканфіскаванае выбуховае рэчыва. Ён паведаміў, што па гэтым факце заведзеная крымінальная справа, аднак ня стаў увязваць былых «алмазаўцаў» з тэрактам 4 ліпеня.

Чуткі пра знойдзены а 1:30 яшчэ адзін «падазроны скрутак» сп. Шчурко не пацьвердзіў. «Такой інфармацыі няма», — сказаў ён.

## СЬЦІСЛА

### Пазьняк пра выбухі: Тыповая работа

Зянон Пазьняк засьцерагае: «Будуць шукаць гайкі, пакеты, парашкі мыльныя, што хочаш. І вядома будуць шукаць у людзей, у якіх родзічы з апазыцыі». Пазьняк перакананы, што цяпер галоўнае — даваць людзям аб'ектыўную інфармацыю пра падзеі: «Яны хочуць людзей запалохаць, каб людзі не займаліся выбарамі, а займаліся ерундой. «Вешаюць усялякіх сабак» на людзей, займаюцца «паляваньнем на ведзьмаў». Гэта тыповая работа ўсіх рэжымаў, тым больш НКВД». Кіраўнік КХП-БНФ лічыць, што мы сталі сьведкамі «падрыхтаванай апэрацыі». Ён заклікаў не паддавацца страху ад ператрусаў, затрыманьняў, допытаў.

### «Белсат» запрацаваў на «Сырыюсе»

Навіна пра гэта зьявілася на сайце тэлеканалу. Вось наладкі, каб глядзець «Белсат»: 12,380 GHz, pol:H, SR: 27500, FEC: s.

### У Купалаўскім — гістарычная драма «Ядвіга»

Прэм'ера спэктаклю паводле п'есы Аляксея Дударава адбудзецца ў Купалаўскім тэатры 30 і 31 ліпеня. Дзеяньне спэктаклю адбываецца на тэрыторыі ВКЛ у XVI ст. Спэктакль расказвае пра гісторыю Ядвігі — дачкі шляхціца Русіноўскага і яе сёстраў Марылю ды Марту. Дэтэктыўнае начыньне — дасьледаваньне жорсткіх забойстваў на Ашмяншчыне. Пастаноўкай «Ядвігі» мастацкі кіраўнік тэатру Валеры Раеўскі працягвае традыцыю гістарычных спэктакляў «Князь Вітаўт» і «Чорная панна Нясьвіжу».

### 1 жніўня — зацьменьне Сонца

Гэтым разам Месяц «схавае» ад нас 43% Сонца. Найцямней у гэты дзень будзе на Віцебшчыне — тут цёмная зона складзе каля 49%. Зацьменьне пачнецца а 11.51, яго агульная працягласьць складзе 4,5 гадзіны. Усім ахвочым паназіраць за рэдкай зьявай варта памятаць пра небясьпеку, што хавае ў сабе назіраньне за Сонцам неабароненымі вачыма. Каб засьцерагчыся ад немінучай траўмы, трэба абсталяваць свае біноклі і аб'ектывы фотаапаратаў цёмным сьвятлафільтрам. Простым аматарам варта паклапаціцца пра кавалак зацемненага шкла.

### Зьнік дакумэнт пра злачынствы НКВД у Катыні

Кіраўнік аддзелу расьсьледаваньняў польскага Інстытуту нацыянальнай памяці Дарыюш Габрыэль сьцьвярджае, што ў іхных архівах няма дакумэнту, які пацьвярджае, што забойствы на рахунку НКВД. Гэты дакумэнт перадаў польскаму боку ў 1992 г. прэзыдэнт Расеі Барыс Ельцын.

**СП, АТ**

**Працяг са старонкі 2.**

### Тэрарысты і актывісты

Лідэр АГП Анатоль Лябедзька сказаў: «Незалежна ад таго, хто зьяўляецца выканаўцам выбуху, хай гэта гарадзкі вар'ят, прыхільнік «Аль-Каіды» ці прадстаўнік сілавога ведамства, гэта будзе выкарыстана ўладамі ў барацьбе з палітычнымі апанэнтамі. Пад прыкрыцьцём барацьбы з тэрарызмам і экстрэмізмам, улады будуць апраўдваць спробы кантраляваць інтэрнэт,ператрусы ў штабах палітычных партый і грамадзкіх арганізацый, арышты апазыцыйных актывістаў».

З кожным днём рабілася ўсё ясьней, што прадказаньні Лябедзькі спраўджваюцца. Спрабуючы адказаць на пытаньне, каму можа быць выгадны выбух 3 ліпеня і паніка, якая б узьнікла ў яго выніку, ананімны аглядальнік «Советской Белоруссии» і вядоўца «Панарамы тыдня» на БТ хорам адказалі — апазыцыі.

У нядзелю ж міліцыянты з Чэрыкава і Клімавічаў дапыталі мясцовых грамадзкіх актывістаў Сямёна Панізоўцава і Сяргея Аржанцава пра здарэньне ў Менску ў ноч на 4 ліпеня. У тым ліку пра выбух у Менску згадаў і ўчастковы міліцыянт, калі дапытваў астравецкага актывіста АГП Мікалая Уласевіча. На допыт выклікалі Кастуся Жукоўскага з Хрысьціянскай дэмакратыі ў Гомелі. Ператрусы правялі ў былога падводніка Паўла Ляхновіча ў Пінску, былой прэс-сакратаркі Казуліна Ніны Шыдлоўскай у Менску. З братоў Шылаў у Салігорску запатрабавалі тлумачэньня, дзе яны былі ў тую ноч. Лішне казаць, што гэта ўсё звычайныя актывісты нацыянальнага руху, якія ня маюць ніякага дачыненьня да экстрэмісцкіх арганізацый, і падобныя допыты ўспрымаюцца як спробы запалохаць палітычных праціўнікаў.

«Гэта быў беларускі падпал Райхстагу», — такія ацэнкі сталі разносіцца па інтэрнэце. І нават Лукашэнка мусіў на іх адрэагаваць, заявіўшы, што ўлада не ўжывае фашысцкіх мэтадаў для барацьбы зь нязгоднымі.

### Віцебскія аналёгіі

Нешта падобнае ўжо адбывалася ў беларускай гісторыі. 14 і 22 верасьня 2005 году, напярэдадні прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі два выбухі прагучалі ў Віцебску. Першы з выбухаў грымнуў ля аўтобуснага прыпынку на праспэкце Фрунзэ, былі траўмаваныя два чалавекі. Паводле вэрсіі сьледзтва, прыстасаваньнем для выбухоўкі сталася піўная бляшанка, начыненая цьвікамі і іншымі мэталічнымі прадметамі. Другі інцыдэнт здарыўся падчас дыскатэкі ля кавярні «Эрыдан» і меў больш значныя наступствы: тады ад выбуху пацярпела больш за 40 чалавек.

Па падазрэньні ў арганізацыі выбухаў восеньню 2006 году быў арыштаваны адзін зь лідэраў незарэгістраванага «Маладога фронту» Павал Красоўскі. Згодна з артыкуламі Крымінальнага кодэксу, паводле якіх падазравалі Красоўскага, хлопцу пагражала ледзь не сьмяротнае пакараньне. Пасьля тыдня знаходжаньня ў віцебскім сьледчым ізалятары Красоўскага адпусьцілі. Болей маладафронтаўца па гэтых абвінавачваньнях не чапалі. Усяго ў Віцебску падобным чынам былі арыштаваныя 60 чалавек. Але выканаўцы і арганізатары віцебскіх выбухаў па-ранейшаму ня знойдзеныя.

Па факце менскага выбуху адразу была заведзеная крымінальная справа паводле ч. 3 арт. 339 «Хуліганства» КК РБ. Былы сьледчы пракуратуры Алег Воўчак адзначае, што звычайнаму хулігану зьдзейсьніць такі акт было б досыць праблематычна. «Там жа пастаянна знаходзіліся супрацоўнікі міліцыі і спэцслужбаў. Побач былі многія дзяржаўныя чыноўнікі, недалёка быў і Лукашэнка. Таму як такое магло адбыцца, зразумець цяжка», — адзначае А.Воўчак.

Старшыня аргкамітэту Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі Павал Севярынец лічыць, што так раскалад мог быць выгадны Расеі. «Падазраю, што за менскімі выбухамі могуць стаяць расейскія спэцслужбы. Час і месца падабраныя так, каб з аднаго боку паказаць Лукашэнку, чаго вартая славутая беларуская стабільнасьць і яго ная «незалежнасьць», а з другога боку — паставіць пад удар апазыцыю перад парлямэнцкімі выбарамі», — кажа П.Севярынец.

### Сілавікі і мэдыкі атрымалі на арэхі

У панядзелак Лукашэнка правёў нараду з прадстаўнікамі сілавых ведамстваў па факце выбуху на Дзень Рэспублікі. Дасталося ўсім. Нарада прайшла ў звыклым стылі — кіраўнік дзяржавы, які ніколі не памыляецца, супраць нягодных чыноўнікаў. З навінак было толькі тое, што ў ліку вінаватых аказаўся гэтым разам непатапляльны і ўсёмагутны сакратар Рады бясьпекі. А.Лукашэнка рэзка раскрытыкаваў за недастатковую апэратыўнасьць як сілавікоў, гэтак і мэдыкаў. Ня ўсе зь яго ных выказваньняў былі ясныя. Стваралася ўражаньне, што застаецца нешта недагаворанае.

«Зразумела, што выбухоўка магла быць толькі ў кустах. Але мне давялося лезьці ў гэтую варонку, каб аддаць загад міліцыі адвесьці людзей. Як вы ахоўвалі? Гэта ўжо пытаньне да прафэсіяналізму міліцыі. Калі такое здарылася, то трэба было варушыцца».

Але асабліва вялікая доля крытыкі дасталася дзяржаўнаму сакратару Рады бясьпекі Віктару Шэйману: «Ня думаю, што вы павінны заставацца на гэтай пасадзе пасьля інцыдэнту. Вы вінаватыя, найперш! Вы на даручэньне прэзыдэнта не адзін год, а дзесяць гадоў ладзіце такія мерапрыемствы. І нічога не зрабілі!»

Шэйману дасталося за тое, што ён не знаходзіўся на мерапрыемстве, пры гэтым падае Лукашэнку справаздачу аб здарэньні. «Я больш за вас ведаю, што там здарылася», — эмацыйна выгукнуў кіраўнік.

Мэдыкі атрымалі за тое, што падчас канцэрту ў гэтым раёне не было брыгады дактароў, а таксама за адкладаньне першай мэдычнай дапамогі проста на зямлі.

А ўжо на наступны дзень пасьля разносу Віктар Шэйман, а разам зь ім і кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Генадзь Нявыглас, былі звольненыя з пасадаў «у сувязі з пераходам на іншую працу». Першыя вынікі менскага выбуху даюць падставу думаць, што ён перадусім стане нагодай для пераатрасаньня сілавых структураў. Роўна як і зьбіцьцё Зянона Ломаця летась. Будзе ён выкарыстаны і для зачысткі апазыцыі, як паказваюць першыя ператрусы і допыты грамадзкіх актывістаў.

**Зьміцер Панкавец**

#### Знак, што з Шэйманам паконча на

Набліжаны да Лукашэнкі дэпутат савету рэспублікі Мікалай Чаргінец, камэнтуючы адстаўку дзяржсакратара Рады бясьпекі, заявіў, што Шэймана атачалі выключна «прафэсіяналы ў зборы кампрамату». «Часам проста ўсё зводзілася да асабістых рахункаў, яны не займаліся па-вялікаму дзяржаўнымі справамі», — цытуе М.Чаргінца агенцтва БелаПАН. Ад камэнтара з нагоды адстаўкі Генадзя Нявыгласа М.Чаргінец устрымаўся. Апошняе можа азначаць, што ёсьць шанцы вяртаньня Нявыгласа на адну з высокіх пасадаў.



**Месца здарэньня. Бачная варонка і сьляды ад «шрапнэлі».**

# Справа «Белага легіёну»

На шосты дзень пасьля выбуху ў Менску міліцыя і КДБ пачалі першыя арышты.



Затрыманыя чацьвёра былых сяброў «Белага легіёну». Гэтая арганізацыя гуртавала моладзь у 1990-я, але апошнія гады прыпыніла дзейнасьць.

Сярод затрыманых супрацоўнікамі КДБ былы лідэр «Белага легіёну» Сяргей Чыслаў **(на фота)**, а таксама колішнія сябры арганізацыі Ігар Корсак, Мірослаў Лазоўскі і Віктар Ляшчынскі, якія апошнім часам ня ўдзельнічалі ў палітычным жыцьці.

Арышты адбываліся па аднолькавай схеме. Супрацоўнікі КДБ 8 ліпеня праводзілі ператрусы на кватэрах актывістаў, а таксама іх родных, пасьля чаго адвозілі на допыт у гарадзкое ўпраўленьне, а ўжо адтуль зьмяшчалі ў сьледчы ізалятар на Акрэсьціна (Валадарка цяпер на рэстаўрацыі). Сваякам абяцаюць, што затрыманых зьмясьцілі ў турму толькі на трое сутак, але як яно будзе насамрэч ніхто ня ведае.

Цікава, што падчас ператрусаў з кватэраў цягнулі ўсё што можна. У Корсака канфіскавалі пакунак з балтамі і гайкамі, адны гумовыя пальчаткі, хаця ў кватэры іх было нашмат болей, а таксама пакеты з-пад соку, якія цёшча Ігара выкарыстоўвае для расады. У Мірослава Лазоўскага па пратаколе канфіскацыі 31 найменьне — ад сыстэмнага блёку кампутару да візытовак. У сястры Сяргея Чыслава забралі старую бляшанку з-пад лаку.

Жонцы Мірослава Лазоўскага далі спаткацца з мужам у сьледчым аддзеле міліцыі. Мірослаў пасьпеў перадаць толькі асабістыя рэчы. Пагаварыць ім не дазволілі.

Маці Сяргея Чыслава Галіна кажа, што яе ператрус засьпеў на лецішчы. «Там нічога не забралі. Напрыканцы я запыталася, ці арыштаваны Сяргей. Мне адказалі, што ён быў затрыманы, але праз нейкі час адпушчаны. Таму я была спакойная», — кажа Галіна Чыслава.

А ўжо ў сераду а 13-й ёй патэлефанавала адвакатка Апанасевіч, якая і паведаміла, што Сяргей Чыслаў знаходзіцца ў ізалятары на Акрэсьціна. Паводле Галіны Чыславай, апошні час ейны сын жыў і працаваў у Маскве, а ў Менск прыяжджаў часам толькі на выходныя да дзяўчыны.

Цешча Ігара Корсака Тацяна Цыцёркіна кажа, што 3 ліпеня сям'я знаходзілася на лецішчы. Вярнуліся яны ў Менску толькі а дзявятай вечара. «На сьвяткаваньне, натуральна, ніхто не хадзіў», — кажа жанчына. Як кажа жонка Ігара Вольга Корсак, сьледчым па справе яе мужа зьяўляецца капітан СУПР ГУУС Танана А.В.

Што да затрыманьня Віктара Ляшчынскага, то тут пакуль ніякай яснасьці няма.

Усім арыштаваным у раёне 35 гадоў. Выглядае на тое, што арышт былых сяброў «Белага легіёну» аналягічны ганебнаму зьмяшчэньню ў сьледчы ізалятар Паўла Красоўскага ў справе віцебскіх выбухаў. Ёсьць уражаньне, што мэта гэтых арыштаў – ня столькі пошук бамбіста, колькі стварэньне асацыяцый між тэрарыстамі і апазыцыяй.

Родныя арыштаваных трымаюцца спакойна, зь іх не ўпадае ў гістэрыю. У сераду сваякі перадалі ў камэру сваім мужам і сынам перадачы. Гэта ўсё беларускамоўныя сем'і. Цешча Корсака актыўная сяброўка Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ, а жонка Лазоўскага — намесьніца старшыні МГА «Бацькаўшчына» і былая прэс-сакратарка Казуліна Ніна Шыдлоўская. Маладыя пераважна знаёміліся ў беларускіх тусоўках.

**ЗП**

#### Што такое «Белы легіён»?

Незарэгістраваная арганізацыя «Белы легіён« была заснаваная на пачатку 1990-х часткай сяброў зьліквідаванага Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў (БЗВ) на базе яго нага моладзевага крыла ДРАБ (Дружыны рэгіянальнай аховы і бясьпекі, т. зв. «Чорныя драбы»). Пры канцы 90-х колькасьць «легіёнаўцаў» не перавышала 200 чалавек. Яны бралі ўдзел у штогадовых спартовых вышкальных зборах і летніках у розных кутках Беларусі.

Сябры «Белага легіёну» ахоўвалі нацыянальныя культурныя акцыі і незалежныя СМІ. Яго ўдзельнікі былі заўважаныя ў маніфэстацыі 17 кастрычніка 1999 г., якая скончылася сутычкамі зь міліцыяй на рагу менскіх вуліц Фрунзэ і Першамайскай. Тады 20 тысячаў чалавек выйшлі патрабаваць адстаўкі Лукашэнкі і расьсьледаваньня зьнікненьняў вядомых палітыкаў. Міліцыя і спэцназ некалькі разоў атакавалі і адступалі, у выніку падчас акцыі 53 міліцыянты атрымалі траўмы.

Затрыманы ў сакавіку 2000 г. за распаўсюд улётак «Белага легіёну» Мірослаў Лазоўскі быў першым асуджаным па артыкуле АК 167.10 («дзейнасьць ад імя незарэгістраваных ці не перарэгістраваных палітычных партыяў, прафсаюзаў ці іншых грамадзкіх аб'яднаньняў»), уведзеным у дзеяньне пры канцы 1999 г.

У жніўні 1998 г. за распаўсюд улётак «Белага легіёну» быў асуджаны і Ігар Корсак. Яго абвінавачвалі таксама ў «распаўсюдзе фашыстоўскай сымболікі», але экспэрты-мастацтвазнаўцы прызналі, што эмблема «Белага легіёну» — знак «спарыш» — ня мае дачыненьня да фашызму і зьяўляецца элемэнтам беларускага традыцыйнага арнамэнту (у тым ліку, ён зьмешчаны на сучасным дзяржаўным сьцягу Рэспублікі Беларусь). На судзе Корсак «прызнаў сваю віну часткова». Ён быў аштрафаваны на 2,5 млн рублёў.

**Антось Каберац**

# Выбух у Менску: qui prodest?

«Каму выгадна?» — гэтае пытаньне задаюць цяпер у сувязі з выбухам 3 ліпеня хіба ўсе. У вэрсіях няма недахопу.

Але амаль усе яны, калі паглядзець аб'ектыўна, не вытрымліваюць выпрабаваньня калькуляцыяй выйгрышаў і пройгрышаў. На тле крыві паўсотні чалавек і страху ўсёй краіны гучыць цынічна, але толькі халодны аналіз можа дазволіць знайсьці адказ на пытаньне, якое сфармулявалі яшчэ старажытныя рымляне.

**Пачнем, скажам, з улады.** Ну, фразу Лукашэнкі з інтэрвію «Камсамолцы» пра «пагромы і выбухі», якія нібыта рыхтуе апазыцыя, не працытаваў толькі лянівы. Дый тое, што кіраўнік дзяржавы застаўся на месцы выбуху, хаця базавыя прынцыпы дзейнасьці службаў бясьпекі патрабавалі ягонага тэрміновага зьнікненьня адтуль, сапраўды дапускае самыя розныя інтэрпрэтацыі.

Але паспрабуем зрабіць тую самую калькуляцыю. На тле шматгадовай мантры пра стабільную і бясьпечную Беларусь тое, што адбылося ў Менску ў ноч з 3 на 4 ліпеня, — мякка кажучы, выклік, а груба — поўха менавіта ўладзе. На галоўнае афіцыйнае сьвята, за два крокі ад месца, дзе сядзеў самы гарант стабільнасьці і бясьпекі, — вось вам. Такі дэманстрацыйны эфэкт, так выглядае, якраз і ўваходзіў у пляны арганізатараў выбуху. Калі гэта ўлады, то яны тады нагадваюць гогалеўскую унтэр-афіцэрскую ўдаву, якая «сама сябе высекла».

Страты навідавоку, а якія выйгрышы? Зваліць злачынства на апазыцыю і разграміць яе дашчэнту? А то яе не грамілі без усялякіх выбухаў... А то яна сама не падыходзіць да выбараў у як ніколі раней расколатым стане... Хіба ў краіне нарастае вал масавага пратэсту, які апазыцыя можа асядлаць і павесьці масы на штурм прэзыдэнцкага палацу, так што для нэўтралізацыі такога жахлівага сцэнару добрыя ўсе сродкі? Нават у мазгох аўтараў баек пры дохлага пацука такое ўяўленьне наўрад ці існуе. А тады навошта?

Нават калі ўлада — халодная пачвара, то менавіта халодны разьлік павінен падказаць пачвары, што такія дзеяньні ёй скрайне нявыгадныя, мэта, якую можна такім шляхам дасягнуць, ня вартая выдаткаў, якія пачвара пры гэтым панясе.

**Цяпер пра апазыцыю.** Ну, вынясем за дужкі ўласныя сымпатыі да яе, уяўленьне, што яна з маральных меркаваньняў на гэта ня можа пайсьці ніколі і ні за што, адкінем нават свае веды пра ўзровень яе арганізацыйнай моцы. Дапусьцім на хвіліну, што яна — халодная пачвара. І які тут балянс? Ну так, ну поўха, і што — народ узьненавідзіць уладу і паўстане супраць яе? Лухта. А страты ў выпадку выкрыцьця — поўны разгром, прычым пры поўным ухваленьні гэтага народам. Ну не вар'яты ж апазыцыянэры.

Шчыраваньні Лукашэнкі ў «Камсамолцы» наконт амэрыканцаў, якія замаўляюць у Беларусі выбухі — праява альбо крайняга цынізму, альбо крайняй непамяркоўнасьці беларускага кіраўніка. Амерыканцы пасьля 9/11 патрацілі мільярды даляраў і ахвяравалі жыцьцямі многіх сваіх грамадзян, змагаючыся з тэрарызмам ва ўсім сьвеце. І спансаваць тэрор зь няпэўнымі мэтамі ў малазначнай па вялікім рахунку для іх краіне — гэта, відаць, менавіта тое, чаго ім не хапае для поўнага шчасьця. Насамрэч, калі б беларуская апазыцыя стала практыкаваць нешта падобнае, перад ёю шчыльна закрыліся б усе магчымыя дзьверы ў ЗША. А паколькі яна да меркаваньня ЗША ставіцца неабыякава, то гэта яшчэ адзін аргумэнт за тое, што ў выбуху яна — ні сном ні духам.

**Вэрсія пра тое, што выбух — разборка паміж клянамі сілавікоў, спроба дыскрэдытаваць міністра Навумава**, адказнага за бясьпеку на сьвяце, таксама ня надта вытрымлівае выпрабаваньне калькуляцыяй. Тое, што ахвотнікі дыскрэдытаваць міністра ёсьць, вельмі імаверна, але якая рызыка! Гэта ж ня Ломаця зьбіць, тут, калі праўда выплыве на паверхню, ініцыятараў разборкі ў такой форме чакае гарантаваны расстрэл. Не, як кажуць, сабе даражэй.

Мне асабіста найбольш імавернай падаецца **вэрсія разборак у барацьбе за ўласнасьць**, якую выказаў мне Аляксандар Фядута.

У Беларусі пачаўся вялікі распродаж. Якімі эксцэсамі суправаджалася прыватызацыя ў суседніх краінах — добра вядома. Пры гэтым пляцоўка ўсіх магчымых беларускіх тэндэраў, конкурсаў і аўкцыёнаў — усяго адна, гэта кабінэт Аляксандра Лукашэнкі. І чаму не дапусьціць, што аднойчы там было сказана: «Вы, Аляксандар Рыгоравіч, нас «кінулі» (варыянт — на нашу цану не пагадзіліся). З намі так нельга. Вы аб гэтым горка пашкадуеце». І як сказалі — так і зрабілі. Банальны рэкет. Як кажуць, бізнэс — нічога асабістага.

Перавага гэтай вэрсіі ў тым, што яна, па-першае, добра тлумачыць дэманстрацыйны характар выбуху — удар нанесены наўпрост па прэстыжы незгаворлівага партнёра. Падругое, яна вытрымлівае, так бы мовіць, тэст на халодную пачвару. Выйгрыш — не няўцямны спадзеў на дэстабілізацыю ці маральнае права на зьнішчэньне апазыцыі, а рэчы сур'ёзныя — падтрыманьне рэпутацыі крутога бізнэсоўца ці, як кажуць, «канкрэтныя бабкі». А рызыка — ну існуе, але не вар'яцкая. Выканаўца — залётны прафэсіянал, ужо даўно пакінуў Беларусь, замоўшчыкі — паважаныя замежныя бізнэсоўцы. Паспрабуй знайдзі, дакажы, а тым больш дастань.

Праўда, варыянт пра чысты рэкет мае таксама свае недахопы. Таму, каго рэкетуюць — у дадзеным выпадку Лукашэнку — трэба неяк паведаміць, хто ж яго рэкетуе і каму ён павінен ісьці на саступкі. А такое пасланьне «засьвечвае» яго аўтара. Дзе б ён ні жыў, улады гэтай краіны яго за такое вядзеньне бізнэсу па галоўцы не пагладзяць.

Але варыянт пра помсту гэтага недахопу пазбаўлены. Бізнэсноравы постсавецкіх краінаў даволі спэцыфічныя: калі цябе «кінулі», ты любой цаной павінен годна адказаць, інакш лічыць цябе «лохам», і «кідаць» будзе кожны. Калі сцэнар такі, то замоўшчык нічога Лукашэнку паведамляць і не павінен, але сваім бізнэсовым партнёрам мякка намякне, што ў свой час Лукашэнка яго «кінуў», а потым у Менску 3 ліпеня 2008 году здарыліся нейкія падзеі.

Нарэшце, **ня выключана, што сапраўднай можа аказацца і першая вэрсія, вылучаная сьледзтвам**. І справа тут ня ў слове «хуліганства», а ў сутнасьці — адзіночка-вар'ят, ну, прынамсі, у пэўным сэнсе вар'ят. Супраць гэтага паўстае чалавечая рацыянальнасьць, паводле якой важныя рэчы маюць сувымерныя прычыны. Але вось у 1981 годзе пасьля замаху на Рональда Рэйгана сьледчыя касьцьмі ляглі, шукаючы тыя важныя, сувымерныя прычыны, хто стаіць за гэтым — рускія, кітайцы, мафія, каму выгадна. А высьветлілася — ніхто, ніякай падбіўкі няма, сапраўды вар'ят Джон Гінклі хацеў такім чынам усяго толькі зрабіць уражаньне на актрыку Джодзі Фостэр, якая не адказвала на ягоныя заляцаньні. І тут формула «каму выгадна» не працуе, немагчыма пралічыць рацыянальнасьць вар'ята.

Вораг, змоўшчык — гэта зразумела, яго хаця б тэарэтычна можна знайсьці, пакараць, адпомсьціць яму, прадухіліць паўтарэньне гэтага жаху ў будучыні. Але што рабіць з усясьветным хаосам, які прымае аблічча звычайнага чалавека, якому чамусьці дастаўляе асалоду проста адчуваць, што лёсы дзясяткаў і соцень людзей — пад ягоным пальцам на маленечкай кнопачцы прыбору дыстанцыйнага кіраваньня?

**Юры Дракахруст, радыё «Свабода»**





Пацешныя выбухі на Лініі Сталіна назаўтра пасьля менскай трагедыі.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Над безданьню ў ілжы

Пяць тысяч чалавек толькі на рэпэтыцыі вайскова-спартовага сьвята ў заказьніку «Лінія Сталіна» наступным днём пасьля тэракту — гэта пра нешта ды гаворыць. Піша **Віталь Тарас**.

Наступным днём пасьля выбуху давялося выпадкам пачуць размову рабочых-зваршчыкаў, якія адарваліся ад працы, каб наталіць смагу півам і заадно — абмеркаваць надзвычайнае здарэньне. Адзін з субутэльнікаў сфармуляваў свае ўражаньні так. Па-першае, за што мы плацім падаткі?.. Па-другое, навошта ў Менску паставілі помнік тым, хто загінуў на піўным сьвяце?.. І па-трэцяе, Сталін у кастрычніку 1941 году... Завершыць думку суразмоўцу не далі, бо астатнім таксама не цярпелася выказацца. Адзінае, што той пасьпеў дадаць — ягоны бацька, маўляў, атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі за тое, што расстраляў восем чалавек на пачатку вайны.

Цяжка знайсьці лёгіку ў гэтым палёце думкі. Але яна ёсьць. Да яе мы яшчэ вернемся.

### Сьвята ў стабільным рэжыме

Нехта даўно падлічыў — самая жудасная катастрофа, стыхійнае бедзтва ці самы крывавы тэракт здольныя цалкам захапіць увагу грамадзтва на два—тры дні. Максымум на тыдзень. Выключэньне — атака 11 верасьня 2001 г., калі загінулі адразу некалькі тысяч чалавек. Апошнія сацыялягічныя апытаньні паказалі, што толькі сёлета ў амэрыканскім грамадзтве пачаў разьвейвацца страх, выкліканы тым тэрактам.

Нядаўняя атака бульдазэрыста на мірных жыхароў Ерусаліму, у выніку якой загінулі пяць чалавек, прыцягнула ўвагу журналістаў хіба што нетрадыцыйным спосабам забойства: бульдозэр падмяў пад сябе некалькі легкавікоў і перакуліў пасажырскі аўтобус.

Выбух у цэнтры Менску падчас сьвяточнага канцэрту, на якім прысутнічаў кіраўнік дзяржавы, апынуўся на першым месцы ў выпусках навінаў Euronews. Але, думаецца, толькі таму, што надта экзатычнымі выглядалі самі месца і час падзеі. Тэракт здарыўся ў разгар галоўнага афіцыйнага сьвята ў дзяржаве, стабільнасьці якой, здавалася, нічога не пагражае. І дзе прафэсійны ўзровень аховы кіраўніка дзяржавы быў напярэдадні прызнаны самым высокім у СНД.

Але што нам да Заходняй Эўропы, ЗША, а тым больш — Блізкага Ўсходу, дзе тэракты даўно зрабіліся суворай штодзённасьцю. Крывавы тэракт, у якім пацярпелі паўсотні чалавек, у тым ліку маленькія дзеці (прыйшло ж камусьці да галавы цягнуць іх на начны канцэрт, дзе сабраліся натоўпы людзей?!) выклікаў шок у беларусаў.

Праўда, як хутка высьветлілася, не ва ўсіх і не надоўга. Галоўны міліцэйскі начальнік адразу заявіў, што «сьвята працягваецца ў стабільным рэжыме». Іншымі словамі — шоў маст гоў он.

### Не палохайце страўса!

Можна не сумнявацца, што калі б тэракт адбыўся б не падчас тэлетрансьляцыі, улады намагаліся б гэты факт схаваць — прынамсі, на нейкі час. Але нават вымушанае хоць нешта казаць, БТ ня ў стане вымавіць анічога, акрамя маны.

Тыя, хто сталі ахвярамі выбуху, не адразу зразумелі, што яны сапсавалі сьвята. Адна з жанчынаў, якой пасекла гайкамі ногі, у інтэрвію карэспандэнту радыё «Свабода» паскардзілася, што ў той час, як машыны хуткай дапамогі вывозілі акрываўленых людзей, канцэрт працягваўся. Гэта яе ўразіла нават больш, чым тое, што зь ёй самой здарылася. Асноўны ляйтматыў дзяржаўных тэлеканалаў быў — інцыдэнт, канечне, непрыемны, але ўсе службы, у тым ліку мэдычная, спрацавалі надзейна, усім аказаная належная дапамога, а ў цэлым радасьць сьвятаў азмрочыць хуліганам не ўдалося.

Публікаваць сьпісы параненых ці хоць бы даць тэлефоны шпіталяў, куды дастаўленыя пацярпелыя, што было крайне важна для сваякоў, асабліва ў першыя гадзіны пасьля выбуху, чыноўнікам не прыйшло да галавы. Навошта? Галоўным было, як нам даводзяць — і чым ганарацца ўлады — не дапусьціць панікі ў шматтысячным натоўпе.

Магчыма, у першыя хвіліны пасьля выбуху гэта было слушна. Але спробы ў наступныя дні ўсяляк прыменшыць маштаб здарэньня, магчымыя наступствы яго для грамадзтва сьведчаць пра бездапаможнасьць і разгубленасьць уладаў. Казаць пра хуліганства, калі ўсім ужо відавочна, што размова вядзецца пра тэракт — гэта палітыка страўса, які спрабуе схаваць галаву ў пясок. Ці, хутчэй, у бэтонную падлогу.

Каторы раз выявілася, што процістаяць сапраўднай пагрозе, дбаць пра бясьпеку людзей — гэта ня тое, што разганяць гумовымі дручкамі купку дэманстрантаў і кідаць іх у аўтазакі. Аўтазакамі ды «суткамі» з тэрарызмам не ваююць.

І яшчэ. Ня трэба ўвесь час загаворваць самі сябе — тэраразм ня пройдзе, у нас гэта немагчыма, мы гэтага не дапусьцім. Дапусьцілі, і ўжо ня першы раз.

### У цені генэралісімуса

Выглядае, улады нечакана для саміх сябе сутыкнуліся з тым, пра што ўвесь час гаварылі раней. Пагроза тэрарызму, гвалту, дэстабілізацыі грамадзтва стала рэальнай, але прыйшла яна не з таго боку, зь якога яе чакалі «аналітыкі» БТ — не з Захаду і ня з боку апазыцыі. А інакш з чаго б гэта «Советская Белоруссия», дый кіраўнік дзяржавы асабіста адразу сталі пераконваць, што інцыдэнт не прывядзе да масавых рэпрэсіяў, што закручваць «гайкі на галовах» (выраз Лукашэнкі) будуць ня ў лідэраў апазыцыі, а ў тых, хто рэальна спрычыніўся да выбуху? Як ні дзіўна, ён найбольш зацікаўлены ў хуткім і аб'ектыўным расьсьледаваньні інцыдэнту. Лукашэнку, які нядаўна абяцаў зладзіць увосень ўзорна-паказальныя выбары, ніякія тэракты не патрэбныя.

Можна было б сказаць, што яму чарговым разам пашэнціла. Як пашэнціла 25 Сакавіка 2006 году, калі чуткі пра тое, што адзін з дэманстрантаў падчас разгону быў забіты, так і засталіся чуткамі.

Можна было б, калі б не 30 траўня 1999 г., калі ў падземным пераходзе на Нямізе загінулі 52 чалавекі, зь іх — 42 дзяўчыны. Трагедыя тады скаланула грамадзтва, найперш — сваім дзікунствам і бессэнсоўнасьцю. Трагедыю памятаюць, але яна нічаму не навучыла. Бо масавыя імпрэзы на дзяржаўныя сьвяты становяцца ўсё больш масавымі, усё больш папсовымі, усё больш пазбаўленымі чалавечага сэнсу і такту.

Нават у ахутаным алькагольнымі парамі мозгу згаданага вышэй пралетара падабенства трагедыі на Нямізе і тэракту на праспэкце Пераможцаў падаецца відавочным. Ён ня хоча плаціць падаткі на міліцыю, якая яго і жыцьці іншых належным чынам не сьцеражэ. Вось толькі, парадаксальным чынам, ён ня хоча, каб яму нагадвалі пра чалавечую трагедыю, ня хоча бачыць помнік загiблым на Нямізе, бо гэта абуджае ў ім дзіўныя пачуцьці, чымсьці муляе. Ён падсьвядома шукае прыстанішча ад сваіх жыцьцёвых праблемаў у Сталіну, які выйграў вайну (прычым, яшчэ ў 1941-м, на аднайменнай лініі абароны пад Менскам), пры якім быў парадак, пры якім зьніжаліся цэны, пры якім расстрэльвалі без цырымоніяў. Яму не прыходзіць да галавы, што гэта і ёсьць сапраўдны тэрор.

Але пакуль электарат захапляецца генэралісімусам, ва ўлады застаецца вялікая спакуса ўжыць сталінскія мэтады, што і хто б там ні казаў.

Пяць тысяч чалавек толькі на рэпэтыцыі вайскова-спартовага сьвята ў заказьніку «Лінія Сталіна» наступным днём пасьля тэракту — гэта пра нешта ды гаворыць. Асабліва замілаваньне менчукоў, відаць, выклікалі імітацыйныя выбухі падчас паказу.

Як ні цяжка гэта прызнаць, у беларускім грамадзтве амаль задушаныя элемэнтарныя чалавечыя пачуцьці. Ня толькі што салідарнасьць — яна ёсьць даволі высокай і складанай грамадзянскай праявай, якая патрабуе ўсьведамленьня сябе часткай нейкай еднасьці, — кудысьці зьнікла звычайная чалавечая спагада да іншых.

Парог болевай адчувальнасьці пасьля тэракту ў Менску пасьпяхова пяройдзены. Значыць, грамадзтва гатова да новых тэрактаў.

# Рэкордны заклад Шыгалава, абвінавачаньні Зэльцэру

10 мільярдаў рублёў — такі заклад заплацілі сваякі генэральнага дырэктара Гандлёвага дому «Ждановічы» Яўгена Шыгалава. Адзін з найбагацейшых бізнэсоўцаў Беларусі быў пад вартай ад 5 красавіка. Шыгалаў абвінавачваецца ў злоўжываньні ўладай або службовымі паўнамоцтвамі.

Акрамя Яўгена Шыгалава ў гэтай справе былі затрыманыя таксама ягоны намесьнік і дзяржаўны чыноўнік, які дапамог завалодаць кавалкам зямлі побач з рынкам «Ждановічы».

7 траўня Яўген Шыгалаў трапіў у Рэспубліканскую турэмную лякарню з падазрэньнем на інфаркт. Пазьней яго перавялі ў РНПЦ «Кардыялёгія». Да моманту ўняседьня заставы каля яго палаты дзяжурыў міліцыянт.

Тым часам грамадзяніну ЗША адвакату Эмануілу Зэльцэру, які з сакавіка знаходзіцца ў сьледчым ізалятары КДБ, прад’явілі афіцыйнае абвінавачаньне ў кантрабандзе наркатычных сродкаў, выкарыстаньні заведама фальшывых афіцыйных дакумэнтаў і камэрцыйным шпіянажы.

Аналягічныя абвінавачаньні (за выключэньнем кантрабанды) прад’яўленыя і сакратарцы Зэльцэра грамадзянцы Расеі Ўладлене Брусковай (Функ).

Нагадаем, Зэльцэр і ягонай сакратарка Функ былі затрыманыя 12 сакавіка ў Менску адразу па прылёце зь Лёндану. Паводле зьвестак сьледзтва, падчас затрыманьня ў адваката знайшлі больш за 100 таблетак, якія ўтрымліваюць наркатычныя і псыхатропныя рэчывы.

Акрамя таго, сьледчым упраўленьнем КДБ па артыкуле «Камэрцыйны шпіянаж супраць Беларусі» распачатая крымінальная справа ў адносінах да грамадзяніна ЗША Джозэфа Кея, далёкага сваяка памерлага грузінскага мільярдэра Бадры Патаркацышвілі. «Я ня ведаю, як мяне можна было абвінаваціць у шпіянажы, калі я ніколі ў Беларусі ня быў», — заявіў Дж.Кей, які зьяўляецца кліентам адваката Зэльцэра. Паводле словаў Дж.Кея, ён не разглядае варыянт прыезду ў Менск, калі гэтага запатрабуе сьледзтва.

**Мікола Бугай, Зьміцер Панкавец**

# У Нясьвіжы паблыталі муміі Радзівілаў

Нясьвіскае пахаваньне Радзівілаў у Фарным касьцёле дадае новыя загадкі. Супрацоўнік навуковага нацыянальнага запаведніку Сяргей Чысьцякоў паведаміў, што ў радавой крыпце ня вызначана, чые муміі ляжаць у 32 саркафагах. Усіх саркафагаў 70.

Паводле гістарычных зьвестак, крыпту ў Нясьвіжы заснаваў у XVI ст. Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка. Перад гэтым ён зьдзейсьніў паломніцтва ў Рым, дзе атрымаў ад Папы Рыгора XIII прывілей на пабудову адмысловага скляпеньня для пахаваньня Радзівілаў. На месцы Сіротка ўчыніў два правілы. Па першае, тут павінны ляжаць толькі Радзівілы. Другое правіла — усіх нябожчыкаў трэба хаваць толькі ў простай вопратцы, без упрыгожваньня, каб пазьбегнуць рабунку.

І ўсё ж труны ў крыпце ўскрывалі. Першы раз у 1905 г., калі неспадзявана спарахнелі некаторыя труны і іх давялося перамясьціць разам з муміямі ў новыя, бярозавыя. Другім разам у 1953 г. савецкія навукоўцы атрымалі загад даведацца княскі сакрэт бальзамаваньня. У сьпешцы дасьледаваньня камісія паблытала пахаваньні. Некаторыя труны доўга стаялі адчыненымі.

С.Чысьцякоў гаворыць і пра зьніклыя саркафагі Радзівілаў. Ён спасылаецца на кнігу польскага дасьледчыка Баляслава Таўрагінськага, выдадзеную ў 1937 г. Аўтар цьвердзіць пра 102 пахаваньні. Але гэтулькі трунаў не ўмясьцілася б у крыпце такіх памераў, якія цяпер.

— Ёсьць тут побач іншыя пахаваньні, — кажа С.Чысьцякоў, — замураваныя ў сьценах. Каб пераканацца, трэба праводзіць дасьледаваньне з адпаведнай тэхнікай.

Дарэчы, сёлета ля Фарнага касьцёлу ў Нясьвіжы мянялі старую агароджу на новую. Калі будаўнікі капалі траншэю, наткнуліся на мармуровыя пліты. Надпіс на першай зь іх сьведчыў пра колішняе пахаваньне. Далей капаць засьцерагліся. Не выклікалі і археолягаў. У выніку пра яшчэ адну загадку гавораць цяпер у Нясьвіжы.

**Галіна Баравая, bulletinonline.org**




**У ПАРКУ ЧАЛЮСКІНЦАЎ АБАРВАЎСЯ АТРАКЦЫЁН**
**Гэта здарылася 7 ліпеня каля 18-й. То быў ланцуговы атракцыён «Карусель». Ад удару наведнікаў гэтага атракцыёну вынесла за межы пляцоўкі. Пацярпелі шэсьць чалавек, сярод іх дзеці. Загінулых няма. Паводле папярэдніх зьвестак сёлета карусель не праходзіла дыягностыкі. Атракцыён быў зроблены ў 1989 г. у Чэхаславаччыне.**

## СЬЦІСЛА

### Краіна матэматыкаў

Цэнтралізаванае тэставаньне па матэматыцы (30 заданьняў) на 100 балаў напісалі 55 чалавек. Летась найвышэйшую адзнаку па гэтым прадмеце атрымалі 13 чалавек. Сёлета ж 90 і больш балаў атрымалі 466 абітурыентаў.

Усяго ў тэставаньні бралі ўдзел 107 тыс. 496 чалавек. 6 тыс. абітурыентаў адказвалі на пытаньні пабеларуску.

### Кандрусевіч заклікае маліцца за візыт Папы

Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч заклікаў вернікаў маліцца за візыт Папы рымскага ў Беларусь. Сам Папа падчас сустрэчы зь мітрапалітам у Ватыкане адносна візыту сказаў: «Калі Бог мне дазволіць».

### Барацьба з «шэрымі» тэлефонамі

У Беларусі пляннуецца ўвесьці адказнасьць абанэнта ў выпадку выкарыстаньня ім, у мэтах атрыманьня паслуг сувязі, тэлефоннага апарату са зьмененым ідэнтыфікацыйным нумарам (IMEI) альбо тэлефоннага апарату, ідэнтыфікацыйны нумар якога занесены ў базу выкрадзеных альбо нелегальна ўвезеных у Беларусь. Пра гэта СТАА «Мабільныя ТэлеСыстэмы» інфармуе абанэнтаў пры заключэньні дамовы.

**ЗП**

# Viva España!

Гэты чэмпіянат Эўропы ўжо пасьпелі назваць самым справядлівым за апошнія дзесяцігодзьдзі. Чэмпіёнам стала тая каманда, якая насамрэч паказала самы прыгожы і відовішчны футбол.

У Аўстрыі і Швайцарыі гішпанцы захапілі ўсіх сваёй гульнёй ужо зь першага матчу, калі разграмілі Расею. Зрэшты, добрага выступу ў групе варта было чакаць — гішпанцы заўсёды няблага стартуюць, але дзіўным чынам ня могуць пераадолець бар’ер чвэрцьфіналу.

І на гэты раз за выхад у чацьвёрку наймацнейшых каманд Эўропы гішпанцы змагаліся зь цягучымі італьянцамі. Высокая арганізацыя гульні ў абароне так і не дазволіла супернікам стварыць хоць адзін небясьпечны момант, але і ў нападзеньні італьянцы выглядалі абсалютна нямоглымі. Усё вырашалі пэнальці — бліскучы Касільяс вывеў сваю каманду далей. Такім чынам, гішпанцы нарэшце зламалі пракляцьце чвэрцьфіналу.

У паўфінале пірэнэйцы ў вясёлым стылі другі раз за першынство разграмілі расейцаў. Нават галяндзкі чараўнік зборнай Расеі Гуус Хідынк быў бясьсільны нешта зрабіць.

Толькі першыя пятнаццаць хвілін каманда Луіса Араганэса не дамінавала ў вырашальнай гульні Эўра зь немцамі. Апафэоз фіналу здарыўся на 33-й хвіліне гульні, калі Фэрнанда Торэс перагнаў бегунка Філіпа Лама, накіраваўшы мяч міма Енса Лемана — 1:0.

Гішпанія чакала гэтай перамогі доўгія 44 гады. Першы працоўны дзень пасьля перамогі быў сарваны — уся нацыя сьвяткавала. У Мадрыдзе каманду сустракалі тысячы фанатаў.

69-гадовы Луіс Араганэс стаў самым сталым трэнэрам, які прывёў сваю каманду да кантынэнтальнага тытулу. Зрэшты, адразу пасьля першынства ён зьехаў працаваць у Турцыю: фэдэрацыя проста не прапанавала яму новы кантракт, бо ня верыла ў перамогу.

Але асабліва цяжка было прадказаць найлепшага футбаліста гэтага Эўра, бо ў гішпанцаў у лідэрах была ўся каманда. Выбар аргкамітэту спыніўся на цэнтральным паўабаронцы Хаві Эрнандэсе.

За ўсю кар’еру ў Хаві было толькі дзьве каманды — «Барсэлёна» і зборная Гішпаніі. Хоць родныя Хаві зьяўляюцца прыхільнікамі іншага клюбу — «Эспаньёлу», за яго выступаў бацька футбаліста і брат. Наш герой ня змог прабіцца ў склад гэтага клюбу праз маленькі рост (170 см). Хлопец вельмі перажываў праз гэта і ўжо не зьбіраўся займацца футболам. Урэшце маці адвяла яго ў футбольную школу «Барсэлёны» — самых прынцыповых супернікаў «Эспаньёлу».

Што да зборнай Гішпаніі, дык футбаліст ніколі не хаваў, што найперш лічыць сябе каталёнцам, а ўжо потым гішпанцам. Хаві з радасьцю апране майку зборнай Каталёніі, як толькі такая каманда зьявіцца. Зрэшты, з прызнаньня футбаліста, ён «у палітыку ня лезе».

З Эўра мы разьвітваемся на чатыры гады, а ўжо 6 верасьня зборная Беларусі матчам у Львове з украінцамі пачне змаганьне за пуцёўку на першынство сьвету — 2010 у Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку.

**ЗП**

# Інтарэс да ПІФаў

Ці магчымыя ў Беларусі калектыўныя інвэстыцыі, незалежныя ад дзяржавы? Піша **Раман Мамчыц**.

Сёлета назіраецца нечуваная цікавасьць да інструмэнтаў інвэставаньня, якія ў нас лічацца «альтэрнатыўнымі», хоць у заходніх краінах даўно сталі неад'емнай часткаю грамадзкай культуры захаваньня ўласных зьберажэньняў. Гэта, у прыватнасьці, ПІФы — паявыя інвэстыцыйныя фонды. Сваіх ПІФаў у Беларусі няма, то нашыя суайчыньнікі купляюць паі іншаземных. Нават кіраўніцтва Нацбанку прызнала факт існаваньня практыкі інвэставаньня ў расейскія ПІФы. Прэс-служба НБ разрадзілася прэс-рэлізам, у якім засьцерагала беларусаў ад інвэстыцый у гэткія рызыкоўныя (з гледзішча Нацбанку) стратэгіі. Нідзе там ня пішацца пра незаконнасьць такіх інвэстыцый, робіцца акцэнт на тое, што дадзеныя апэрацыі зьяўляюцца валютнымі і патрабуюць дазволу Нацбанку.

То бок улады прызналі за замежнымі ПІФамі права на існаваньне. Магчыма, сёлета нарэшце будзе гатовы Закон пра інвэстыцыйныя фонды, аднак пакуль у Нацбанку не вядзецца размовы пра легалізацыю калектыўных інвэстыцый. Карані такой непрыязі ў тым, што ПІФ ня можа зьяўляцца юрыдычнаю асобаю. Затое кіроўная кампанія — юрыдычная асоба, яна ж і ажыцьцяўляе эмісію гэткага спэцыфічнага віду каштоўных папер — паёў, уласьнік якіх укладае грошы ў пэўную інвэстыцыйную стратэгію, а не ў прадпрыемства. «Віртуальнасьць» і палохае чыноўнікаў з Нацбанку, выклікаючы асацыяцыі з «МММ».

Аднак гэта, як той казаў, лірыка. На сёньня заканадаўства дазваляе грамадзянам інвэставаць свае легальна заробленыя сродкі як у айчынныя актывы, так і ў замежныя, а юрыдычным асобам дае права пры наяўнасьці адпаведных ліцэнзій кіраваць грашовымі сродкамі фізычных асоб. Варыянтаў некалькі.

### Інвэставаньне фізычнаю асобаю ў замежныя ПІФы

Заканадаўства прыроўнівае паі інвэстыцыйных фондаў да каштоўных папер, набыцьцё якіх грамадзянінам Беларусі ў тым разе, калі яны былі эмітаваныя нерэзыдэнтамі РБ, адносіцца да апэрацый, зьвязаных з рухам капіталу. Нацбанк кваліфікуе інвэстыцыі ў ПІФы як простыя інвэстыцыі ў карпаратыўныя правы прадпрыемстваў-нерэзыдэнтаў РБ.

На ажыцьцяўленьне гэтых апэрацый патрэбны дазвол Нацбанку, той жа дазвол дае права і на адкрыцьцё валютнага рахунку за мяжою, праз які грамадзянін Беларусі будзе весьці транзакцыі з паямі. Дазволу не патрабуецца, калі рэзыдэнт, знаходзячыся за мяжою, набывае паі ў якасьці каштоўных папер, якія выконваюць функцыю разьліковых дакумэнтаў, аднак тут ёсьць свае нязручнасьці: па-першае, трэба самому кудысьці ехаць; па-другое, патрэбная пэўная юрыдычная падрыхтоўка альбо кансультацыя юрыста ў той краіне, дзе будзе ажыцьцяўляцца ўгода, а гэта ўсё каштуе грошай.

Што датычыць канкрэтных выпадкаў інвэстыцый у расейскія ПІФы, дык дазвол на адкрыцьцё валютнага рахунку ў расейскіх банках не патрабуецца, бо некаторыя беларускія банкі зьдзяйсьняюць транзакцыі з гэтымі ПІФамі. З украінскімі ПІФамі беларускія банкі не працуюць, як і з польскімі і іншымі ПІФамі, эмітаванымі ў краінах ЭС. Аднак выдаткі ў выпадку супрацы з расейскімі ПІФамі тыя самыя, што ў выпадку з украінскімі, і вышэйшыя, чым калі ўзяць заканадаўства эўрапейскіх краін (напрыклад, у выпадку інвэставаньня ў латвійскі Парэкс, шырока вядомы ў вузкіх колах беларускіх бізнэсоўцаў). Бо ў Расеі зь беларускіх грамадзян спаганяецца той жа падаходны падатак, што і зь іншых нерэзыдэнтаў, — 30%, нягледзячы ні на якія саюзныя дамовы. Тое самае ва Ўкраіне, але ПІФы там нашмат больш прыбытковыя. Абіраючы краіну, ПІФы якой інвэставаць, трэба спачатку ўпэўніцца, што ў Беларусі з гэтай краінай дзейнічае дамова аб ліквідацыі падвойнага падаткаабкладаньня, каб не плаціць падатак яшчэ і ў Беларусі.

### Стварэньне беларускай кампаніі кіраваньня замежнымі актывамі

Заканадаўства дазваляе давернае кіраваньне сродкамі фізычных асоб, аднак толькі для фінансава-крэдытных арганізацый. Аптымальная форма існаваньня кіроўнай кампаніі — нябанкаўская фінансава-крэдытная арганізацыя. Наяўнасьць ліцэнзіі на валютныя апэрацыі ды адкрыцьцё рахункаў за мяжою абавязковая. А яшчэ — статутны фонд у 5 млн эўра, пры гэтым неграшовая частка фонду ня можа перавышаць 20%. Тэарэтычна стварыць такую кампанію рэальна, аднак адразу давядзецца сутыкнуцца зь нездаровай увагай уладаў — дагэтуль жа такіх кампаній не існавала.

### Стварэньне ўласнага ПІФу

Дый стварыць ПІФ тэарэтычна магчыма. На практыцы ж пакуль ніхто не спрабаваў, бо вельмі складана. Калі ўспрымаць ПІФы як кшталт вэнчурных капіталаўкладаньняў, мажліва надаць яму форму дэпазыту з пэўным тэрмінам, але зьменнай прыбытковасьцю. Але гэту дзейнасьць маюць права ажыцьцяўляць толькі банкі. Па-другое, трэба штораз узгадняць зьмены прыбытковасьці дэпазыту з Нацбанкам. Па-трэцяе, інвэставаць у беларускі фондавы рынак — суцэльны мазахізм, пры нізкай ліквіднасьці, якую ён дэманструе, паўнавартасны гандаль там немагчымы. Што да замежных рынкаў — глядзіце вышэй.

**Раман Мамчыц**

куратар рэгіянальнага разьвіцьця інвэстыцыйнай кампаніі Kings Capital у Беларусі.

## СЬЦІСЛА

### Канец манаполіі «Белтэлекаму»

ІП «Альтэрнатыўная лічбавая сетка» (гандлёвая марка «Атлянт Тэлекам») атрымала ліцэнзію на разбудову стацыянарнай тэлефоннай сувязі.

### Бэнзін падаражэў, на дызпаліва ліміт

З 10 ліпеня «Белнафтахім» уводзіць новыя цэны на нафтапрадукты, што рэалізуюцца праз АЗС. Бэнзін маркі АІ-92 будзе каштаваць цяпер 2 230 рублёў за літар, АІ-95 — 2 540 руб., А-76 (Нармаль-80) — 1 760 руб., дызпаліва — 1 940 руб. Таксама на дызпаліва на запраўках Белнафтахіму ўведзены ліміт — 100 літраў у адзін бак.

### Расейцы хочуць выкупіць БелМТС

Расейскі сузаснавальнік СТАА «Мабільныя ТэлеСыстэмы» пацьвердзіў зацікаўленасьць у набыцьці кантрольнага пакету акцыяў апэратара «за вялікія грошы». Заснавальнікамі БелМТС зьяўляюцца «Белтэлекам» — 51% і ААТ «Мабільныя ТэлеСыстэмы» (Расея) — 49% статутнага капіталу.

### Узяліся за рэкляму

Разьвіцьцё вонкавай рэклямы стала асобнай нагодай для абмеркаваньня на паседжаньні прэзыдыюму Саўміну. Паводле словаў старшыні Камітэту дзяржкантролю Зянона Ломаця, 19 рэклямных кампаніяў, што працуюць у Беларусі, павінны ў бюджэт дзяржавы 1 млрд рублёў. Да праблемаў рэклямы Саўмін вернецца ў жніўні.

### «Газпром» купляе альтэрнатыву

Дасягненьне дамоўленасьці аб супрацоўніцтве ў нафтагазавай сфэры значыцца галоўным пунктам у праграме турнэ прэзыдэнта Расеі Дзьмітрыя Мядзьведзева па сярэднеазіяцкіх краінах. Кіраўнік «Газпрому» Аляксей Мілер паведаміў, што манаполія «Газпром» гатовая купляць у Азэрбайджане і Туркмэністане максымальна магчымыя аб'ёмы газу па рынкавай цане ў абмен на гарантыі таго, што яны ня будуць удзельнічаць у нафтагазавых праектах у абыход Расеі. Экспэрты лічаць, калі прапанова Масквы будзе прынятая, стымулы пабудовы альтэрнатыўных трубаправодаў у абыход Расеі зьнікнуць.

**Сямён Печанко; паводле Gazeta.ru, naviny.by, БелаПАН, ej.by**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

### 25 чэрвеня

#### Бабруйск

Актывіст незарэгістраванага «Руху «За Свабоду» **Алесь Чыгір** даў тлумачэньні сьледчаму службы ўласнай бясьпекі МУС па факце зьняволеньня ў ноч з 29 на 30 траўня. П алітыка затрымалі нібыта за пагрозы на адрас таксоўшчыка й зьвінавацілі ў дробным хуліганстве. Паводле сп.Чыгіра, у пастарунку міліцыянты зьбілі яго. Палітык атрымаў адказ на сваю скаргу з УУС Магілёўскага аблвыканкаму, у якім гаворыцца, што пры затрыманьні міліцыянты дзейнічалі ў адпаведнасьці з законам. Нагадаем, судзьдзя **Натальля Чарапуха** адміністрацыйную справу супраць палітыка адправіла на дасьледаваньне, а самога яго вызваліла з-пад варты ў залі суду.

#### Менск

Актывіст дэмакратычнага руху **Алесь Галавач** паведаміў журналістам, што супрацоўнік КДБ патрабаваў ад яго інфармацыю ў кабінэце дэканату. За адмову пагражаў студэнту адлічэньнем зь пятага курсу Ўнівэрсытэту культуры. Са словаў Алеся, кадэбіст цікавіўся, дзе той быў у часе прадпрымальніцкіх акцыяў.

### 26 чэрвеня

#### Менск

Калегія ў грамадзянскіх справах Менскага гарсуду не задаволіла касацыйную скаргу заяўнікаў «Эўрапейскага маршу». Старшынявала судзьдзя **Іна Яблакава**. Рашэньне судзьдзі Савецкага раёну Менску **Алены Муранцовай** пакінутае бязь зьменаў. Згодна зь ім, арганізатары «Маршу», які прайшоў 14 кастрычніка 2007 г., павінны выплаціць «Менскзелянбуду» 1400000 рублёў за «шкоду маёмасьці юрыдычнай асобы».

### 27 чэрвеня

#### Менск

Суд Маскоўскага раёну Менску пакараў праваабаронцу з Маладэчна **Эдуарда Баланчука** 10 суткамі арышту і штрафам памерам 1млн 50 тыс. рублёў. Э.Баланчука днём раней затрымалі супрацоўнікі міліцыі і КДБ каля офісу БХК, дзе мела адбыцца нарада па маніторынгу за выбарамі. На яго склалі два пратаколы: непадпарадкаваньне законнаму распараджэньню ці патрабаваньню службовай асобы пры выкананьні ім службовых паўнамоцтваў (арт. 23.4 КаАП) і дробнае хуліганства (арт. 17.1 КаАП). Прысуд вынес судзьдзя **Харкевіч**.

### 30 чэрвеня

#### Менск

Суд Кастрычніцкага раёну Менску асудзіў актывіста «Маладых дэмакратаў» **Міхаіла Пашкевіча**, высунутага Палітрадай АГП у Цэнтравыбаркам, на 7 сутак арышту. Судзьдзя **Рыта Шаграй** таксама аштрафавала М.Пашкевіча на 10 б.в. (350 тыс. рублёў), а журналістку радыё «Свабода» **Любоў Лунёву** на 8 б.в. (280 тыс. рублёў) за непавагу да суду. Актывіст быў затрыманы ўвечары 28 чэрвеня ў Менску, калі вяртаўся з паседжаньня палітрады АГП. Пашкевіча затрымалі на чыгуначным вакзале нібыта за нецэнзурную лаянку. Дзьве ночы ён правёў на Акрэсьціна. Паколькі Міхаіл асуджаны да «хатняй хіміі» па «Справе 14-ці», любое парушэньне, тым больш арышт, можа пацягнуць за сабой зьняволеньне.

Суд Цэнтральнага раёну Менску арыштаваў на 10 сутак нібыта за лаянку актывіста кампаніі «Эўрапейская Беларусь» **Яўгена Афнагеля**. Раней ён быў завочна асуджаны на 7 сутак арышту за ўдзел у дэманстрацыі 1 траўня. Яўгену давядзецца правесьці ў турме 17 сутак.

#### Кобрынь

З **Алесем Мехам**, актывістам БНФ, супрацоўнікам Кобрынскага ўпраўленьня магістральных газаправодаў ААТ «Белтрансгаз» не працягнулі працоўнага кантракту. Сп.Мех сваё звальненьне зьвязвае з палітычнай дзейнасьцю. Са словаў актывіста, 6 чэрвеня яго выклікалі да кіраўніка прадпрыемства і ў прысутнасьці супрацоўніка КДБ папярэдзілі, што калі ён ня выйдзе са сьпісу 110 кандыдатаў ад АДС на выбарах у парлямэнт, кантракт зь ім ня будзе працягнуты. Праз тыдзень А.Меху, паводле яго словаў, пачалі пагражаць, што бяз працы застанецца і яго жонка-настаўніца.

#### Лельчыцы

Падатковая інспэкцыя запатрабавала ў актывіста АГП **Мікалая Гаўрыленкі** падаць дэклярацыю аб прыбытках і маёмасьці за 2007 г. Маўляў, ёсьць інфармацыя пра атрыманьне актывістам даходу ад продажу аўтамабіля. Дэклярацыяў запатрабавалі таксама ад жонкі, маці й цешчы сп.Гаўрыленкі.

#### Нясьвіж

Райвыканкам адмовіўся ўзгодніць дамову арэнды памяшканьня пад карэспандэнцкі пункт газэце **«Нясвіжскі час»**. Раней было забаронена прадаваць «НЧ» у крамах ды праз «Белсаюздрук».

#### Баранавічы

Актывіста незарэгістраванага «Маладога фронту» **Арцёма Ластавецкага**, які адбываў 7-суткавы арышт за распаўсюд партрэтаў палітвязьня **Андрэя Кіма**, за дзень да вызваленьня з ізалятару адвезьлі на другі суд. А.Ластавецкаму далі штрафу 40 б.в., таксама юнак мусіць кампэнсаваць шкоду, нанесеную будынкам і дзяржустановам. За нанясеньне палітычных графіці маладафронтаўцу пагражалі крымінальнай справай, але пракурорская праверка вырашыла, што шкода не адпавядае такому пакараньню.

Актывісту «МФ» **Зьмітра Станкевіча** далі 10 сутак за «дробнае хуліганства». Хлопца затрымалі падчас раздачы ўлётак з інфармацыяй пра А.Кіма.

#### Ганцавічы

Маладафронтаўцаў затрымалі за распаўсюд інфармацыі пра палітвязьняў. **Алене Чарняк** і **Сьвятлане Жулевіч** далі па 175 тысяч штрафу, **Андрэю Караваеву** і **Сяргею Скіпару** — па 15 сутак.

### 1 ліпеня

#### Гомель

У дачыненьні да вылучэнца ад АДС на выбары, актывіста незалежнага Беларускага прафсаюзу працаўнікоў радыёэлектроннай прамысловасьці **Леаніда Судаленкі** РУУС Савецкага раёну Гомелю пачало праверку. Адначасова падатковая інспэкцыя зацікавілася аплатай мабільнай сувязі Л.Судаленкі за два апошнія гады.

#### Жодзіна

Актывістка грамадзянскай кампаніі «Эўрапейская Беларусь» **Раіса Купрушына** была затрыманая падчас збору подпісаў за ўступленьне Беларусі ў Эўрасаюз. На спн.Купрушыну склалі пратакол, улёткі сканфіскавалі.

### 2 ліпеня

#### Менск

Актывіст кампаніі «Эўрапейская Беларусь» **Павал Юхневіч** трапіў на 7 сутак на Акрэсьціна. За ўдзел у афіцыйным мітынгу прафсаюзаў 1 траўня П.Юхневіч быў завочна асуджаны судом Першамайскага раёну.

#### Рэчыца

Рэчыцкі райвыканкам адмовіўся паставіць на ўлік раённую арганізацыю незалежнага прафсаюзу працаўнікоў радыёэлектроннай прамысловасьці. Начальніца ідэалягічнага аддзелу райвыканкаму **Натальля Цярэня** не патлумачыла прычыны адмовы. У Рэчыцы існуе першасная суполка прафсаюзу РЭП, створаная на заводзе «Рытм».

### 3 ліпеня

#### Магілёў

А 12-й у цэнтры Магілёва супрацоўнікі спэцназу затрымалі «маладафронтаўцаў» **Тацяну Буланаву**, **Расьціслава Панкратава**, **Антося Станкевіча**, **Яўгена Чарнічэнку**, **Станіслава Сенакосава**, **Паўла Давыдава**, **Алега Філатава**, **Паўла Варашылава**. Маладзёны зьявіліся на ўрачыстым адкрыцьці гарадзкой ратушы ў саколках з надпісам «Жыве Беларусь». Старшы лейтэнант **А.Кабылінскі** сканфіскаваў у затрыманых налепкі і сьцягі для экспэртызы.

#### Менск

Улады Менску не дазволілі пікеты салідарнасьці з **Аляксандрам Казуліным**.

Пікеты, прымеркаваныя да другой гадавіны працэсу над палітыкам, плянаваліся 6—7 ліпеня.

### 5 ліпеня

#### Бершты

Невядомыя пранiклі на сядзібу **Аляксандра Мілінкевіча** ў вёсцы Бершты і прабілі колы дзьвюх машынаў. Палітык зь сям'ёй быў у хаце. Суседзі бачылі нямясцовыя аўто з падазронымі людзьмі. На 6 ліпеня ў Мілінкевіча былі заплянаваныя сустрэчы з кандыдатамі ў Палату прадстаўнікоў. Падобным чынам спрабавалі сарваць у красавіку сустрэчы Мілінкевіча з жыхарамі Мастоў і Горадні.

### 7 ліпеня

#### Зьміцер Завадзкі

Споўнілася восем гадоў з моманту зьнікненьня апэратара расейскага тэлеканалу ОРТ **Зьмітра Завадзкага**. 7 ліпеня 2000 г. З.Завадзкі адправіўся ў Нацыянальны аэрапорт «Менск» сустракаць калегу — журналіста ОРТ Паўла Шарамета. З таго часу Завадзкага ніхто ня бачыў. Яго аўтамабіль быў знойдзены ў аэрапорце. У 2002 г. Менскі аблсуд прызнаў вінаватай у выкраданьні журналіста групу былога байца спэцпадразьдзяленьня МУС «Алмаз» **Валер'я Ігнатовіча** і прыгаварыў двух чалавек да пажыцьцёвага зьняволеньня.

#### Менск

Актывісту **Арцёму Ластавецкаму** паведамілі пра выключэньне зь Беларускага ўнівэрсытэту інфарматыкі і радыёэлектронікі. Пра гэта, зь ягоных словаў, яму паведаміў рэктар БДУІРу **Міхаіл Батура**, пісьмовай пастановы яшчэ няма. Фармальная нагода — акадэмічная непасьпяховасьць на першым курсе. Хоць паводле вынікаў летняй сэсіі хлопец быў пераведзены на другі курс.

**СП**

# Віцебскі сьлед



Толькі праз чатыры дні стала вядома, што першую бомбу знайшлі за дзьве гадзіны да выбуху.

Працяг са старонкі 1.

Аўтары вышэй працытаваных выказваньняў папросту забыліся пра віцебскія нераскрытыя выбухі, за якія ніхто ня ўзяў адказнасьці? Калі б гаворка ішла пра іншых людзей, магло б узьнікнуць падазрэньне, што яны заведама адводзяць сьледзтва ўбок ад правільнага сьледу. Але тут усё прасьцей: палітыканства. За ўладу зубамі трымаюцца, горла перагрызуць. Тым ня менш, удалося! Сьледзтва скіравалі на... апазыцыю! Ужо затрымліваюць, трасуць — Лазоўскі, Жукоўскі, Корсак.

Адводу ўвагі грамадзтва ад віцебскага сьледу ёсьць тры рацыянальныя тлумачэньні — тэорыі змовы адкіну, яны не паддаюцца доказу.

Па-першае, выбухі ў Менску нявыгадна нагадваюць, што за тры гады найбуйнейшы ва Ўсходняй Эўропе сілавы апарат ня здолеў знайсьці аўтара тэрактаў. Што гэты апарат, значыцца, хутчэй рэпрэсіўны, чым праваахоўны. З аддзеламі КДБ у кожным раёне — такога не было нават у СССР часоў халоднай вайны! — і ня могуць раскрыць.

Па-другое, выбары. Як ні круці, а дзеяньні тэрарыста(ў) яўна накладаюцца на выбарны цыкл у краіне, дзе насельніцтва арганізавана і датэрмінова аддае свае галасы тым, каму сымпатызуе мадам Ярмо.

Па-трэцяе, такія крайнія псыхічныя дэфармацыі, як тэрарызм, нараджаюцца ня ўсюды і ня скрозь, а часьцей на фоне сацыяльнае напружанасьці, палітычнае гістэрыі, дэгуманізацыі, масавага псыхічнага разладу, і тут ёсьць што аналізаваць.

## Тэхнічны бок справы



Дыскрэдытацыя палітычных праціўнікаў здавалася галоўным клопатам уладаў першыя дні пасьля тэракту. На фота: Генадзь Нявыглас.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Ня ў кожнай краіне Ўсходняй Эўропы закладаюць бомбы. У Латвіі, Эстоніі, Літве, Польшчы, Славаччыне тэрактаў ад часу вызваленьня з-пад расейскага ўплыву не бывала.

Ва Ўкраіне — так, было. Прычым, заўважце, перад выбарамі. У 1999 г. бомбу ўзарвалі на мітынгу прыхільніцы яднаньня з Расеяй Вітрэнкі, каб абвінаваціць у тым апазыцыю. А ў 2004 г. выбухоўку падклалі пад кіеўскую сынагогу — акурат калі зь Ючшанкі ляпілі вобраз «вузкалобага нацыяналіста».

Расейскія перадвыбарныя выбухі — клясыка гідкага жанру. Ва ўсіх краінах нагнятаньне сытуацыі гуляла на руку ўладам, а заварвалі кашу, як цяпер выходзіць наяву, не сілавікі, а бізнэсоўцы, ці дакладней назваць іх — мафіёзінуварышы, зацікаўленыя ў захаваньні палітычнага статус-кво. У некаторых выпадках бачны быў удзел замежных спэцслужбаў, якія распаўсюджваюць на чужыя краіны мэтады, недапушчальныя ва ўласных краінах. Перадвыбарныя выбухі ў Беларусі, прынамсі па сваім часе дасканала ўпісваюцца ў схемы постсавецкіх «палітгэхналёгій».

Усе гэтыя кантэксты для уладаў нявыгадныя. Але выгадна ня выгадна — кажыце праўду. Не трымайце людзей за балванаў.

У крытычных сытуацыях, як пасьля тэрактаў, грамадзкая патрэба ў праўдзівай інфармацыі абвастраецца. Яе дыктуе сам інстынкт самазахаваньня, яна неабходная для правільнае працы інтуіцыі.

У грамадзтвах з больш развітай палітычнай культурай хлусьня пра тэракты каштуе ўрадоўцам, а то і тамтэйшым «Лукашэнкам» іхных пасадаў. Так было ў Гішпаніі з Азнарам. Фактычна тое самае адбылося ў Штатах з рэспубліканцамі.

## Далей па віцебскім сьледзе.

Моцны выбух прагрымеў у Віцебску 22 верасьня 2005 г. Гэта адбылося на дыскатэцы каля кавярні «Эрыдан». Пад тыя ж папсовыя рытмы, што і ў сталіцы. (Ня выключана, што тэрарыст падсьвядома помсьціцца за ўласныя дыскатэчныя — г. зн. псыхалягічнага характару паразы.)

Паводле сьледчых прэцэдэнтаў, у большасьці выпадкаў за самаробнымі бомбамі стаяць псыхічна неўраўнаважаныя людзі.

Раскрыць такія злачынствы ня проста.

18 гадоў спатрэбілася амэрыканцам для арышту Унабомбэра. Ад 1978 году ён дасылаў бомбы поштаю, атакуючы ўнівэрсытэцкіх выкладчыкаў, інтэлектуалаў, уплывовых палітыкаў і мэнэджараў. Раскрылі яго выпадкова — ягоны брат натрапіў на падазроныя нататкі.

У ЗША ФБР дагэтуль ня выйшла на троп тых, хто пры канцы 2001 г. рассылаў лісты з бактэрыямі сібіркі. Сьледчыя, як высьвятляецца, узялі памылковы сьлед — яны шукалі «навукоўца-вар'ята».

Графолягі дыягнаставалі, што почырк на лістах з бацыламі, якія трапілі ў Кангрэс ЗША і буйныя СМІ, належаў асобе з прыкметамі самоты і душэўнага разладу. Зь іншага боку, высокая ступень чысьціні парашку паказвала, што іх вырабіў не дылетант у бактэрыялягічнай сфэры. А рамесьніцкі, хатні характар фізычнае апрацоўкі сьмяротнае мукі даваў падставы думаць, што зламысьнік ня меў доступу да апаратуры дзейных лябараторый. Усё гэта разам вывела сьледзтва на адносна вузкую групу калявайсковых навукоўцаў. За імі татальна віжавалі. Іх прасьвечвалі наскрозь. На іх сканцэнтравалі ўсе рэсурсы. Урэшце, на аднаго зь іх палі падазрэньні, але доказаў не набралася.

Вэрсіі, што за рассылкай тых сьмяротных лістоў стаіць тэрарыстычная арганізацыя, замежная дзяржава, на чым настойвалі кансэрватары, ці — пра што гаварылі лібэралы — партыя вайны ў адной з амэрыканскіх сілавых структураў, не прымаліся ўсур'ёз.

ФБР мела гіганцкія рэсурсы ў распараджэньні. Зрэшты, беларускія сьледчыя маюць ня меншыя, калі наважваюцца распрацоўваць усіх, хто мае доступ да адпаведных хімічных рэактываў, дый яшчэ й кандыдатаў у дэпутаты ад апазыцыі ў прыдачу. Дубаломам з Вашынгтону не прыйшло ў галаву дапытаць па справе сібірскай язвы Барака Хасэйна Абаму, а ў яго ж і колер скуры, і імя падазронае.

Жарты далоў. Цяжка раскрыць злачынства, якое ўчыніў скрытны апантанец. Дый няма гарантыі, што аўтарства віцебскіх і менскага выбухаў належыць аднаму чалавеку.

## Сувязь між выбухамі і згвалтаваньнем

Сьледчыя не вінаватыя, што яны не раскрылі віцебскіх выбухаў. Але яны нясуць адказнасьць

за тое, як вялося сьледзтва.

Прыёмы яго грамадзтва не даведалася б, каб не апазыцыя. Так-так, апазыцыя.

Павал Красоўскі быў ня першым «подозреваемым». І ня тым, хто правёў у турме найдаўжэй. Але Красоўскі быў з нацыянальнага руху. І маці, і нявеста ў яго былі такія самыя, за яго змагаліся. Яго было каму абараняць, было каму шум падняць. Гэта дзякуючы яму мы ведаем: калі ён адмовіўся «прызнацца», яго... абвінавацілі ў згвалтаваньні. Які абсурд — скажаце вы. А нізасьць якая? Дзе тут гонар афіцэра-сьледчага? А таксама — які дрымучы непрафэсіяналізм. Красоўскі аказаўся ў «патэнцыйных тэрарыстах» з простай прычыны — ён арганізоўваў культурна-адукацыйныя летнікі для беларускамоўнай моладзі. А гэта ж у вачах рыцараў плашча і кінжала самае страшнае. Бо гуртуе людзей.

Старшы сьледчы ў асабліва важных справах Генэральнай пракуратуры Расолька — кажуць, ён быў блізкі з былым, зусім былым генпракурорам Віктарам Шэйманам — праявіў у выпадку з Красоўскім асабістую бязьлітаснасьць і «прафэсіяналізм». Але, мяркую, ён толькі абапіраўся на інфармацыю ад «служыцеляў закону» зь іншае структуры. Хто з экстрэмісцкай моладзі мог? Вось вам нашыя дасье — напрыклад, Красоўскі. Мо Красоўскага падсунулі ўвогуле толькі для таго, каб сарваць ягонае абраньне старшынём «Маладога фронту».

Пракалоліся — думалі, хлопец крохкі, але аказаўся ня зломак. Дый — шчасьце! — меў у пашпарце штампы, што ў дні віцебскага выбуху знаходзіўся не ў Беларусі. А што калі б штампаў не было?

Як іх не было ў братоў Віталя і Юр'я Мурашкаў. Паказаньні супраць братоў Мурашкаў у свой час даў жыхар Віцебску, які цяпер знаходзіцца ў псыхіятрычнай лякарні. Паўгоду яны адседзелі. Доказаў няма? А ты пасядзі, пасядзі. З рэцыдывістамі пасядзіш. Мы і брацішка твайго пасадзім.

Сьледзтва выйшла на іх пасьляператрусаў у работнікаў гадзіньнікавага заводу ды майстэрняў, бо гадзіньнікавыя мэханізмы зламысьнік выкарыстаў у абодвух выбуховых прыстасаваньнях. У 23-гадовага Юр'я і 25-гадовага Віталя бацька калісьці працаваў гадзіньнікавым майстрам, і пасьля ягонай сьмерці ў кватэры засталося шмат разабраных гадзіньнікаў. Да таго ж браты скончылі тэхналягічны ўнівэрсытэт, мелі «залатыя рукі», а яшчэ «нетыповую зьнешнасьць» (каго шукалі пасьля выбухаў 4 ліпеня? Архетып тэрарыста для ўсіх, хто жыве расейскім тэлебачаньнем) — абодва не па-славянску чарнявыя і смуглявыя.

Замучаная страхам за дзяцей жанчына рыхтавала ліст да Аляксандра Лукашэнкі, за якога, дарэчы, галасавала ў 2001 годзе. Журналістам патлумачыла: «Ня веру, каб ён, маючы сваіх двух сыноў, не паслухаў мяне, маці!» Але адправіць не пасьпела. Ні доказаў, ні суду, а кіраўнік краіны, вандруючы па Гомельшчыне, ужо выдаў краіне прыгавор: «В Витебске два охламона взорвали имитационное устройство и думали, что их не найдут. Их быстро вычислили, нашли, и они уже рассказали, где брали порох и как хотели попугать людей в двух местах».

Толькі тады цешча старэйшага з братоў зьвярнулася ў незалежныя мэдыі. Яна даказвала: хлопцы не вінаватыя, зь іх хочуць зрабіць «паказальных злачынцаў на паказальным працэсе». Людміла Балаболічава атрымала суворае папярэджаньне ад сілавікоў за «парушэньне таямніцы сьледзтва». Але розгалас дапамог.

**Калі Павал Красоўскі адмовіўся «прызнацца» ў выбухах, яго абвінавацілі ў згвалтаваньні.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Вось чаму віцебскі сьлед узгадваць ня хочуць — бо мучылі людзей, ламалі. Мэтады як у 1950-я, толькі што цяпер ужо пазьбягаюць крайняй меры.

Дзякуй што ў краіне дагэтуль трымаецца арганізаваная апазыцыя. У 2007-м, як пачалася кампанія дыскрэдытацыі КДБ, быў арыштаваны чарговы падазраваны — маёр віцебскага ўпраўленьня Камітэту Дзямідаў. Ягоныя маці і жонка адразу кінуліся ў незалежныя СМІ. Як трывога, то да Бога, кажуць людзі.

А мэтады сьледзтва былі тыя самыя і супраць «свайго».

Гэта пасьля, са словаў генпракурора Міклашэвіча, стане вядома, што «на палях» Віцебскай справы за паралельна выяўленыя злачынствы было асуджана каля 60 асобаў. Уяўляеце маштаб? Калі 60 пасадзілі, колькіх арыштоўвалі? І як жа Беларусі ня быць у сусьветных лідэрах па колькасьці вязьняў.

Дарэчы, адстаўны амэрыканскі навуковец Стывэн Гатфіл, абвінавачаны ў рассылцы сібіркі, спагаяне з ФБР 5 мільёнаў 825 тысяч даляраў за шкоду, нанесеную ягонай рэпутацыі. А яго ж нават не арыштоўвалі! Проста адсочвалі і публічна назвалі падазраваным.

Дык гэта ў іх, на Захадзе, дзе «маленькі чалавек неабаронены». У нас, у «государстве для народу», Паўлюк Красоўскі ці маёр Дзямідаў дачакаліся, окей, не пяці мільёнаў беларускіх рублёў, дык хоць прабачэньняў?

Юнака, які мае гонар мець адрозныя палітычныя погляды, абвінавацілі ў згвалтаваньні, каб ён прызнаўся ў тэракце, у дзень якога ён быў за кардонам. Гэта не ў садамаўскім Іраку і не ў Гуантанама, пра якое ўсе чулі і ніхто ня бачыў, а ў Беларусі сегодня. Гасударстве для народу. Не для чалавека — для народу. Бо народ гэта нешта агульнае, рукамі не памацаеш. Красоўскі, браты Мурашкі, гэбіст Дзямідаў, Міраслаў Лазоўскі — гэта не народ. Гэта вінцікі. Кшталту тых, што былі залітыя ў бомбу — таксама псыхааналітычна, дарэчы.

Можна сабе ўявіць, што чакае аболтуса зь Віцебску, які меў няшчасьце атрымаць гайку ў канечнасьць. Папацягаюць яго. Будзе знаць, як хадзіць на канцэрты «За Беларусь».

## Інкубатар для бамбістаў

Унабомбэры час ад часу нараджаюцца. Што зробіш — няма роду без выроду, а шаленцам у нашыя часы таксама даступны порах. Толькі ў Беларусі не адна бяда — маньяк. «Гасударства для народу» выйшла на першыя месцы ў сьвеце па колькасьці самагубстваў (36,8 на 100 тыс. насельніцтва ў 2007 г.; для параўнаньня: у Нямеччыне — 13,5, у Малдове — 17,25), на першыя месцы па колькасьці забойстваў на душу насельніцтва. Плюс страшнае лідэрства па колькасьці вязьняў. З гэтае глебы вырас беларускі тэрарызм.

Беларусы памятаюць пра Ганчара, і пра Карпенку памятаюць. А тыя людзі, безымянныя, бо не палітычныя, што тысячамі гніюць жыўцом у сьмярдзючых багнах турмаў — толькі таму што быццам бы няправільна інтэрпрэтавалі падатковае заканадаўства? А тыя тысячы, што без пары палезьлі ў пельку, яны на чыім рахунку? А астматык Парсюкевіч, якому ўкарацілі жыцьцё на дзясятак гадоў? Не зьдзіўлюся, калі за выбухамі стаіць чалавек, што трапіў у жорны найноўшае беларускае параноі. На Зямлі пад белымі крыламі за гістарычна кароткі тэрмін адбылася імклівая дэгуманізацыя. Чалавечы патэнцыял дэградаваў, разбуранае грамадзянскае пачуцьцё, адсутнічае нацыянальная салідарнасьць — усё тое, што ляжыць у аснове разьвіцьця малых эўрапейскіх краінаў.

Вось куды можна зайсьці па віцебскім сьледзе.

Улады кінулі ўсе сілы на дыскрэдытацыю палітычных праціўнікаў, хоць ня маюць на тое ніякіх падставаў. Гэта і ёсьць прыклад фактычнага распальваньня нянавісьці, мэханіка дэгуманізацыі.

Кажуць, палітыка брудная справа. Але няма грамадзтва без палітыкі. Паталёгіі палітыкі лякуюцца праз адкрытасьць крытыкі, свабоду слова.

А што чытаем мы? «Президент, который был на концерте, действовал в присущей ему хладнокровной и решительной манере. После доклада своей Службы безопасности о случившемся А.Г.Лукашенко немедленно пришёл на место происшествия, ободрил пострадавших, дал кому следует конкретные указания. Хотя вполне могло статься, что рядом могла таиться ещё одна бомба...». Кажуць, што гэтая газэта пішацца для аднаго чалавека. Няслаба ж гэты чалавек хоча, каб яго хвалілі.

Асобныя словы расчараваньня — на адрас асобных незалежных журналістаў, якіх адзін раз ня выгурылі з прэс-канфэрэнцыі, і вось яны ўжо хваляць улады за «палітыку адкрытасьці ў дачыненьні да ўсяго, што зьвязанае з тэрактам». Дзе тое пабачылі? Першы зарад знайшлі за дзьве гадзіны да выбуху і не спынілі канцэрту, каб не парушыць піярлегенду пра стабільнасьць. Даведалася краіна пра гэта толькі праз чатыры дні і толькі таму, што чэсныя людзі ў сілавых структурах папросту не змаглі сьцярпець такой дзікасьці і зьлілі факт у тыя самыя незалежныя СМІ. Маем справу з аднабокай інфармацыяй і мэтадычнай дэзынфармацыяй адначасова. Спытайцеся цётку Маню, хто ўзарваў бомбу ў Менску. Калякін нейкі, апазыцыя-гніды! — скажа яна. І гэта вы называеце галоснасьцю і адкрытасьцю?

## Ізноў Віцебск

Віцебск мае свае палітычныя і мэнтальныя асаблівасьці. У сілу геаграфічнай блізкасьці і транспартнай прывязкі да Пецярбургу гэты горад колісь падпаў пад наймацнейшы ўплыў расейскай культуры, што адбілася на «духу места». Але гаворка цяпер не пра лірыку.

У БССР «Віцебская справа» стала свайго роду юрыдычным Чарнобылем, які расплюшчыў вочы на маральнае падзеньне, нялюдзкі характар савецкай прававахоўнай сыстэмы. Тады, нагадаю, у Наддзьвіньні дзейнічаў маньяк — гвалціў, забіваў жанчынаў. Дзясяткамі. І гадамі арыштоўвалі «вінаватых»: сьледчыя вялі справы, пракуроры абвінавачвалі, судзьдзі падмахвалі, небаракі прызнаваліся — садзілі іх, расстрэльвалі. А забойствы паўтараліся. Спатрэбіліся хтосьці сумленьнейшыя як палкоўнік Грыб і сьледчы Ігнатовіч — будучыя старшыня парлямэнту і генпракурор часоў незалежнасьці, — каб дакапацца да праўды. Тым часам савецкія міністры, генэралы пакрывалі сыстэму, пры якой вінаватых прадукавалі «по плану», абы не псаваць статыстыку.

Навука «Віцебскай справы» не прайшла намарна для беларускае Фэміды. Іначай бы сёньня сытуацыя (і ўладаў у тым ліку) была б горшая — ужо пакрываўся б каростай той Мурашка ў Жодзіне, і толькі выбух у Менску яго ўратаваў бы. На гэты раз органы сьледзтва таксама ідуць па віцебскім сьледзе. Сьмерцяў на ім пакуль няма. Але кроў у любым разе кроў. Хочацца спадзявацца, што тэракты лукашэнкаўскай пары таксама прывядуць да рэвалюцыі сьледчых практык у Беларусі. Каб мэтады сьледзтва — арыштаваць дзясяткі людзей, а раптам сярод іх знойдзецца злачынца — засталіся ў мінулым. І каб сьледчыя перасталі абслугоўваць палітыкаў(а).



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Бомбу знайшлі за дзьве гадзіны да выбуху, але канцэрт не спынілі. Фота зроблена прыкладна з таго месца, дзе пазьней выбухнула бомба.**

# Кузьма Казак: «Вайна ў Беларусі выглядала невыносна агіднай»

З гісторыкам **Кузьмом Казаком** гутарыць **Наталка Бабіна**.



Гісторык Кузьма Казак — дасьледчык Другой сусьветнай вайны, кіраўнік аб'яднаньня гісторыкаў «Гістарычная майстэрня». Усплёск цікавасьці грамадзкасьці выклікала падрыхтаваная ім кніга «Германскія страты на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1944 гг.: аналіз і вынікі». І гэта стала нагодай для нашай гутаркі.

Гаворка выдае ў спадару Казаку нараджэнца Палесься: ён з Альшан — самай багатай, зь яго слоў, вёскі Беларусі, усе мужчыны якой ад пачатку ХХ ст. езьдзілі на заробкі ў Амэрыку, а ў другой палове — на шабашкі ў Сібір. Цяпер тут шырока разьлягаюцца цяпліцы, а магутныя фуры-мэрсэдэсы аднавяскоўцаў развозяць агуркі і памідоры ва ўсе канцы Расеі. Сямсот чалавек з Альшанаў жывуць у Амэрыцы, а некаторыя ўжо вярнуліся назад... У сям'і бацькоў было дзесяць дзяцей, Кузьма — наймалодшы. Сям'я хацела, каб менавіта ён атрымаў асьвету. Каб усьцешыць маму, пасьля будатраду студэнт Кузьма Казак купіў першы ў жыцьці капялюш і ў ім зьявіўся дома: менавіта капялюш для мамы быў сымбалем інтэлігентнасьці.

Для самога ж спадара Казака сымбаль інтэлігентнасьці — гаварыць праўду аб выніках сваіх дасьледаваньняў, пазьбягаючы як ідэалягічных клішэ, так і сэнсацыйнасьці.

## Гістарычная майстэрня

Наша гутарка адбываецца ў памяшканьні Гістарычнай майстэрні па адрасе вул.Сухая, 25, у аднапавярховым доўгім белым доме, які глядзіць на сквэр. Вуліца пакаты спускаецца ўніз, на вузкім тратуары старыя дрэвы, шум мэгаполісу прыглушаны — тут захаваўся куточак таго раёну, які старыя менчукі называлі «Каля Яўрэйскіх могілак». Сквэр — гэта тое, што ад могілак засталося.

У доме з даваенных і ваенных часоў неабшаляваныя сьцены, невялікія вокны з вузкімі рамамі, граюць пад нагамі няроўныя дошкі падлогі. Вядомыя прозьвішчы тых, хто жыў тут на пачатку стагодзьдзя — вартаўнік габрэйскіх могілак Берковіч, служачы Любава-роменскай чыгункі на імя Кузьма Іванавіч, агароднiца на прозьвішча Казак... Пра гэтыя супадзеньні гісторык Кузьма Іванавіч Казак паведамляе з усьмешкай: маўляў, вось і ня вер пасьля гэтага ў супадзеньні і гістарычныя паралелі! Але ўвогуле гісторыя дому трагічная: падчас вайны ён знаходзіўся ў гета, а потым, магчыма, зьяўляўся перасыльным пунктам для прымусовых работнікаў зь Беларусі — остарбайтэраў... А пасьля вайны тут быў ЗАГС — жыцьцё патрабавала свайго. Потым — швачны цэх, склад будаўнічых матэрыялаў...

**«Наша Ніва»: Дык што такое Гістарычная майстэрня?**

**Кузьма Казак:** Гістарычная майстэрня ў Менску — гэта аб'яднаньне гісторыкаў, якія вывучаюць найноўшую гісторыю Беларусі — найперш пэрыяд Другой сусьветнай вайны, цікавячыся не арганізацыйнай і кіраўнічай роляй камуністычнай партыі ва ўсенароднай барацьбе, а гісторыяй штодзённасьці — тым, што прыўносіць у строгую навуку ня толькі складаную праўду, але і трагічную паэзію. І сам гэты дом — сьведка і сымбаль гэтай трагічнай штодзённасьці.

Тут прадстаўленыя экспазыцыі, прысьвечаныя вязьням гета і канцэнтрацыйных лягераў, лёсам беларускіх остарбайтэраў, а таксама арганізуюцца часовыя, часта вельмі цікавыя, выставы. Наведваньне экспазыцый і выставаў бясплатнае. Падобныя майстэрні ёсьць амаль у кожным горадзе Нямеччыны, у Беларусі яна — адна.

## Галакост архітэктуры

**«НН»: Вы з такой любоўю расказалі пра гісторыю гэтага дому, які шмат каму можа падацца проста баракам...**

**КК:** Ведаеце, з 40 тыс. чалавек, якія наведалі Майстэрню, толькі 27 назвалі сябе карэннымі мянчанамі! Можа, акурат праз гэтыя магутныя міграцыйныя працэсы і губляе Менск так імкліва ўсе рысы, якімі прывязваў да сябе сваіх жыхароў? Можа, праз гэта лічыцца, што сьветлыя і ўтульныя шматкватэрныя дамы могуць стаяць на касьцях ці на месцы зьнесеных старых «баракаў», што шырокія, выпрастаныя, зручныя для аўтамабіляў вуліцы могуць пралягаць на месцы пакручастых і вузкіх менскіх завулкаў, якімі стагодзьдзямі крочылі мянчане... І гэта — сапраўдны галакост у архітэктуры. Асэнсаваньня каштоўнасьці забудовы гораду, няхай сабе самай простай, ягонай тапанімікі — няма. Адрамантаваўшы гэты дом, падкрэсьліўшы яго рысы, мы спрабуем паказаць якраз гэтую каштоўнасьць.

## Дзьве канцэпцыі вайны

**«НН»: У чым адметнасьць Вашага падыходу да гісторыі Другой сусьветнай вайны?**

**КК:** Існуе дзьве канцэпцыі гісторыі вайны, і калі вы прыхільнік адной зь іх, то вы бачыце зусім іншае, зусім іншую культуру, зусім іншыя твары, чым калі вы трымаецеся іншай. Стваральнік першай канцэпцыі — кіраўнік НКВД Цанава. У 1949 г. выйшла ягоная першая кніга, у якой ён даваў асноўныя палажэньні гэтай канцэпцыі: вайна — гэта барацьба, у ёй ёсьць пераможцы і пераможаныя, пераможцы — гэта савецкія салдаты, падпольшчыкі, партызаны, а пераможаныя — гэта немцы і паліцаі. У кнізе Цанавы калябаранты названыя «найзьлейшымі ворагамі» савецкіх людзей, то бок па ступені адказнасьці яны нават пастаўленыя над нямецкімі салдатамі. Гэта стала дзяржаўнай канцэпцыяй, і так у нас гавораць пра вайну дасюль.

Другая канцэпцыя, якая нараджаецца: вайна — гэта гісторыя пакут. Якая была вайна ў Беларусі? Вайна мела шмат аблічаў. Вайна пачалася ў нас у 1939 г. На Піншчыне, Берасьцейшчыне былі магутныя ўкраінскія ўплывы, на Гарадзеншчыне — польскі, на Віцебшчыне, Магілёўшчыне адначасова адчуваўся расейскі дух. Случчына, Навагрудчына, Баранавіччына — там больш было беларускамоўнай культуры. І шматкультурны Менск. Жыцьцё разнастайнае, калярытнае, ня прасталінейнае.

Падчас акупацыі асноўнай дзейнай асоба ў Беларусі — жанчына. У нас пра гэта не гаварылася, але лёс жанчыны, якая засталася пад акупацыяй, — гэта суцэльны страх, суцэльная трагедыя. Ніхто больш не цярпеў у вайне, як жанчына. Паўмільёна германцаў, партызаны і падпольшчыкі — хто іх карміў? Толькі жанчыны, бо ім не было куды падзецца. А галоўнае, што легла на жанчыну, — захаваць жыцьцё сямейнікаў, дзяцей, старых. І гэта ва ўмовах жорсткасьці, якая была нормай: жорсткія немцы, жорсткія паліцаі — у жорсткасьці яны пераўзыходзілі немцаў, жорсткія партызаны — больш за 2000 партызанаў былі расстраляныя самімі партызанамі за гвалт супраць мірнага насельніцтва.

Калі вайна скончылася, нямецкія жанчыны, якія пацярпелі ад гвалту савецкіх салдат, арганізоўваліся ў суполкі, дзе маглі пазбавіцца псыхалягічных хвароб...

У нас мужчынскі гвалт быў таксама масавы і страшны, але ніхто з жанчын нічога пра гэта не гаварыў. Маладая прыгожая жанчына наагул ня мела шанцаў выжыць. Немцы часта паводзілі сябе, як заваёўнікі, а партызаны часта лічылі, што такія жанчыны — спэцыяльна засланыя немцамі, каб раскласьці маральны стан атраду. Страх беларускіх жанчын застаецца зь імі да сьмерці. Калі ў Майстэрні яны тут зьбіраюцца... Такія гісторыі расказваюць! Вось гэта і ёсьць гераізм: яна выжыла, яна падняла дзяцей... А ўзаеміны паміж немцамі і остарбайтэрамі ў Нямеччыне: як гэта было, ці было каханьне, ці было сяброўства... Як адбывалася вызваленьне, якога так чакалі? Жанчыны, былыя остарбайтэры, расказваюць, што штрафбатальёны, якія ішлі першымі, ставіліся да расейскіх, беларускіх, украінскіх дзяўчат яшчэ больш жорстка, чым да немцаў.

І ўсё гэта заставалася ў памяці. Штотыдзень мы ладзім сустрэчы людзей, якія перажылі тыя падзеі, і запісваем іх аповеды. Мы ставім на мэце дасьледаваць гэты бок вайны.

Такіх гісторый, як у Майстэрні, вы не пабачыце ў Музэі Вялікай Айчыннай вайны — і сюды прыходзяць іншыя людзі.

## З вайны можна выхоўваць агрэсію, а можна — гуманізм

**«НН»: Гэта зусім іншае вызначэньне вайны і перамогі. Гэта пачалавечы.**

**КК:** Гігантаманія, мілітарызм патрэбныя генэралам. Гістарычная майстэрня — гэта вельмі ўдалы беларуска-нямецкі праект: ён тычыцца складанага дыялёгу, ён тычыцца гісторыі штодзённасьці — і цяперашняга, і таго часу. Ён тычыцца людзей, якія не былі героямі ў войску. Так здарылася, што іх вывезьлі, што яны трапілі ў палон... Тут да іх ставіліся з падазрэньнем, і яны замоўчалі... Нам удалося пачуць іхныя галасы — у самым простым сэнсе гэтага слова. Мы запісвалі іхныя аповеды — яны ўзрушваюць і зачароўваюць.

Але сама гісторыя залежыць ад каштоўнасьцяў грамадзтва. І калі паміж Беларусьсю і Нямеччынай ёсьць дыялёг, то ўнутры нашага грамадзтва яго няма. І вайна дасюль выкарыстоўваецца для культывацыі агрэсіі, варожасьці. Гісторыку трэба рэальна глядзець на рэчы, а не хлусіць. Гісторыя вайны можа быць прыкладам таго, як людзі страчваюць сябе з абодвух бакоў. Як яны перастаюць быць людзьмі, не адчуваюць сябе людзьмі — у літаральным і самым страшным сэнсе гэтага слова. З вайны можна выхоўваць агрэсію, мілітарызм, а можна — гуманізм і маральнасьць. І калі мы гэтага не зразумеем, то градус агрэсіўнасьці, градус варожасьці ў грамадзтве будзе павышацца.

## Каго зьнішчалі партызаны?

**«НН»: Вашая кнігу «Германскія страты на тэрыторыі Беларусі...» падаецца сэнсацыйнай. Ці Вы сапраўды гаворыце ў ёй, што з паловы мільёна забітых партызанамі меншасьць склалі нямецкія салдаты?**

**КК:** Тут няма сэнсацыйнасьці. І яе не павінна быць. Але я спрабую сказаць тое, што я выявіў.

Нідзе не было такога шырокага партызанскага руху, як на тэрыторыі Беларусі: савецкія, беларускія (пра гэта часта піша Сяргей Ёрш), украінскія, польскія партызаны, «зялёныя» — салдаты, якія трапілі ў акружэньне і спрабавалі выбрацца, ня ведаючы мовы, традыцый... Тут былі і звычайныя марадзёры. Тут былі атрады, якія абаранялі канкрэтныя вёскі...

Частка насельніцтва спачатку мела досыць ляяльнае стаўленьне да немцаў: у нямецкіх дакумэнтах часта адзначаецца, што вэрмахт сустракалі хлебам-сольлю. У Палескім рэгіёне нават не існавала мяжы фронту, бо тут былі непралазныя балоты і лясы. Аднак адразу за вэрмахтам прыйшлі айнзацгрупы, якія не пакінулі насельніцтву ніякіх шанцаў на выжываньне: габрэяў, сем'і савецкіх актывістаў, усіх, хто супрацьўляўся, адразу зьнішчалі.

**«НН»: Сьцьвярджаецца, што ў Беларусі нямецкія страты ў выніку дзеяньняў партызан склалі паўмільёна чалавек. Ці так гэта і як гэта можна праверыць?**

**КК:** Я пачаў з укладаньня сьпісу нямецкіх гарнізонаў. Гарнізон, узброены пост, застава — гэта асноўная адзінка акупацыі. Празь іх усё ідзе. На сёньня ў маім сьпісе 2500 гарнізонаў, заставаў, пастоў. Партызанскія напады, паводле дакумэнтаў, былі ўчыненыя на 1200 такіх адзінак, на некаторыя зь іх неаднакроць. У справаздачах партызаны дакладалі: зьнішчаны такі і такі гарнізон. Узьнікае пытаньне: а колькі ж было зьнішчана людзей пры кожным нападзе? Хто складаў гарнізон? Кожны гарнізон складаўся з 3—5 немцаў, астатнія маглі быць ненямецкімі калябарантамі: ці то мясцовыя вясковыя мужчыны, ці то рускія, украінцы, літоўцы і г.д.

**«НН»: Хто ўваходзіў у мясцовую паліцыю?**

**КК:** Матывы ўступленьня туды былі розныя. Часта гэта быў мясцовы хлопец, які атрымаў позву, і меў перад сабой выбар: або ён ідзе, або адмаўляецца, і тады паводле законаў ваеннага часу будзе расстраляная ўся ягоная сям'я.

Калі падсумаваць усе дадзеныя, то, аказваецца, за гады вайны партызанамі сапраўды было забіта і паранена ня менш за паўмільёна людзей. Саміх немцаў — меншасьць, астатнія — з калябарантаў. Тут жа была ўся Эўропа: французы, мадзьяры, італьянцы, тут знаходзілася Руская вызваленчая армія, украінскія, літоўскія, латыскія атрады. Вельмі значныя страты зазнала грамадзянская адміністрацыя: вясковыя старасты, супрацоўнікі нямецкіх установаў. Часта бывала так, што мясцовыя партызаны не чапалі, скажам, старасту, які ім дапамагаў, а прыходзілі немясцовыя — і расстрэльвалі, прычым ня толькі яго, а ўсю сям'ю.

Пры бамбардзіроўках, падрыве цягнікоў таксама больш страт было сярод насельніцтва, чым сярод непасрэдна нямецкіх салдат. Хто разьбіраў, падрываючы цягнік, хто там едзе, грамадзянскія людзі ці вайскоўцы? Адсюль і высновы.

## Сьметнік у Трасьцянцы

**«НН»: Але, думаецца, Вас могуць абвінаваціць у дэгераізацыі вайны, у тым, што Вы прыніжаеце памяць аб вайне.**

**КК:** Фанфарныя гукі заглушаюць пакуты. А сярод партызанаў і сярод мірных жыхароў столькі трагедый! Напярэдадні Дня Перамогі, Дня Рэспублікі ну як пра гэта казаць? Вось і пускаюць па праспэкце танкі, і над імі — «Боінг» на невялікай вышыні... Пераказаць праўду амаль немагчыма... А вайна ў Беларусі была вельмі непрыгожай.

206 500 чалавек зьнішчаныя ў Трасьцянцы, а там робяць гарадзкі сьметнік. Вось і ўся наша памяць! У Беларусі дагэтуль няма музэю гісторыі Галакосту. Дзяцей з Азарычаў не прызнаюць вязьнямі канцлягеру! У вайне сярод зьнішчаных людзей вельмі шмат абсалютна невінаватых. Вось пра іх нельга забывацца ў першую чаргу. У Беларусі, у параўнаньні з суседзямі, дагэтуль няма закону аб ахвярах нацызму, чаго дамагаюцца непасрэдныя сьведкі нацызму ў Беларусі.



Полацак. Від на кляштары ад Верхняга замку. Гравюра невядомага аўтара.

# Калі Полацак стаў Вэнэцыяй?

Швайцарскі дасьледчык склаў унікальную кнігу пра першую беларускую сталіцу. Піша **Алег Дзярновіч**.

У выдавецкай анатацыі да кнігі зазначана, што «да гэтага моманту наўрад ці існавала дасьледаваньне, якое б падавала гісторыю асобнага гораду ўсходнеславянскага рэгіёну на працягу такога працяглага пэрыяду». Можна пагадзіцца: ранейшыя і сучасныя манаграфічныя дасьледаваньні Полацку ахопліваюць абмежаваныя храналягічныя пэрыяды ды напісаныя археолягамі, якія імкнуліся выкарыстоўваць таксама пісьмовыя крыніцы.

Чым жа адметная кніга швайцарскага дасьледчыка, навуковага супрацоўніка катэдры Новай і Найноўшай гісторыі Ўсходняй Эўропы і яе культур Унівэрсытэту Пасаў (Нямеччына)?

Гэта праца менавіта сацыяльнага гісторыка, які надае вялікую ўвагу гісторыі права. Паводле жанру кнігу можна аднесьці да дасьледаваньня па мікрагісторыі — калі на прыкладзе аднаго паселішча, нахай і такога значнага, як Полацак, праглядаюцца тэндэнцыі разьвіцьця цэлага краю ці рэгіёну.

Аабістае стаўленьне аўтара да тэмы ілюструе цытата, узятая ім для пачатку назвы кнігі — «Аб полацкай Вэнэцыі». Услаўленьне Полацку як сярэднявечнай Вэнэцыі Ўсходняй Эўропы паходзіць ад «Хронікі» Мацея Стрыйкоўскага (XVI ст.) і тыцыца не архітэктуры, а менавіта сацыяльнага ладу ды грамадзкіх уяўленьняў жыхароў гораду. Потым ужо ў пачатку XVII ст. была зробленая старабеларуская кампіляцыя «Хронікі» Стрыйкоўскага, і ў «Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай» ёсьць адпаведны разьдзел — «Аб полацкай свабодзе, або Вэнэцыі», у якім услаўляецца рэспубліканскі лад і самакіраваньне палачанаў, што ўзялі сабе за ўзор звычаі жыхароў старажытных Атэнаў і Спарты.

Дасьледчык Райк Айнакс з унівэрсытэту Фрыдрыха Шылера (Ена) адзначае, што Родэвальд разглядае горад на Дзьвіне як прыклад «гарадзкой жыццёвай прасторы», геаграфічна і структурна разьмешчанай паміж Эўропай Цэнтральна-Ўсходняй ды Ўсходняй.

Паводле Родэвальда, Полацак, эканамічная і культурная значнасьць якога ўзрастала пачынаючы з XII ст., толькі з XIV ст. інтэгруецца ў рэгіянальны кантэкст Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы. Між тым Родэвальд характарызуе сёньняшнія беларускія тэрыторыі ВКЛ, дзе ў Сярэднявеччы і раньнім Новым часе праваслаўны ўсходнеславянскі сьвет сутыкаўся з лацінскім уплывам, як пераходную зону, альбо зону перасячэньняў без адназначнай прыналежнасьці да Ўсходняй ці Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы. І ў «полі напружанасьці» гэтага культурнага спатканьня ён крэсьліць рысунак цэнтральнаўсходнеэўрапейскага гарадзкога жыцьця.

Для ілюстрацыі сваёй канцэпцыі інтэграцыі Родэвальд прапануе мэтамарфозы храму Сьв.Сафіі, пабудаванага пад бізантыйскім уплывам у XI ст. і сымбалічна канкурэнтнага падобным храмам у Кіеве і Ноўгарадзе. Пасьля рэканструкцыі ў храм абарончага тыпу ў XV і XVI стст. бажніца панесла значныя страты ад пажараў і войнаў XVII і XVIII стст. ды нарэшце набыла бляск барока. Малюнкі, што падаюць гэтыя этапы разьвіцьця храму, зьмешчаныя нават на вокладцы кнігі.

Але ўсё ж гісторыка найбольш цікавяць нават ня вонкавыя праявы жыцьця гораду, а камунікатыўныя працэсы паміж рознымі калектыўнымі і карпаратыўнымі «акторамі» гарадзкой прасторы. Часам гэтыя працэсы могуць быць ня бачнымі маласпрактыкаванаму воку. Пад аналіз трапляюць такія катэгорыі, як «адносіны», «намеры», «рамкі дзеяньняў» і «прастора дзеяньняў», «мова» і «публічнасьць». І як перакрыжоўваюцца адрозныя інтарэсы розных грамадзкіх групаў? Як выражаліся ўнутрыгарадзкія супярэчнасьці ў розныя эпохі? Этнічная і канфэсійная разнастайнасьць жыхароў гораду ператварала «камунікацыю» паміж рознымі групамі ў практычную неабходнасьць.

У раньні пэрыяд уплыў на гарадзкое жыцьцё аказвалі вараскія, рускія ды літоўскі князі. Але Родэвальд мяркуе, што стасункі паміж князямі і гараджанамі мелі пераважна сымбалічны характар. Хоць летапісы і спасылаюцца на нейкія формы народных сходаў, але зусім мала можна сказаць пра сацыяльныя слаі гораду. Усё больш важным для ўтварэньня гарадзкога соцыюму стаў, пачынаючы з XIII ст., гандаль з Рыгай. Гэта азначала ўзмацненьне кантактаў з вонкавым сьветам, з камэрсантамі і «лацінянікамі», але таксама патрабавала рэгуляцыі канфліктаў у замежным гандлі — палачане папросту вучыліся вырашаць падобныя канфлікты на ўзроўні пісанага права.

У часы ВКЛ, за Ягелонамі, Полацкам кіравалі намесьнікі. Заходнеэўрапейскія прававыя мадэлі ўсё часьцей рабіліся ўзорам для арганізацыі гарадзкога ладу Полацку, і ў гэтым яго кірунак разьвіцьця розьніўся ад кірунку разьвіцьця гарадоў Масковіі — у сфэры фармаваньня аўтаномнай гарадзкой грамады з унутранай дыфэрэнцыяцыяй ды ўзрастаньнем значнасьці прававых дачыненьняў. Наданьне Полацку ў 1498 г. Магдэбурскага права стала апагеем гэтага працэсу.

У часы шляхецкай Рэчы Паспалітай (1569—1772) Полацак належаў да «малых сярод сярэдніх гарадоў» дзяржавы, але ўсё больш саступаў па значнасьці перад Віцебскам, Менскам, Горадняй. У горадзе зьявіліся габрэі і езуіты, каталіцкія ордэны і кляштары, уніяты. Узьнікі міжканфэсійныя канфлікты. Каталікі ж дэманстравалі сваё веравызнаньне ў рэгулярных гарадзкіх працэсіях, што не магло не паўплываць — у пляне канфэсіялізацыі і сацыялізацыі — таксама на праваслаўных: зьявілася публічнасьць. Але разьвіваўся яшчэ адзін сталы «канфліктны патэнцыял» — спрэчкі пра публічныя фінансы. І хоць ранейшае эканамічнае значэньне Полацку ўжо было страчанае, але на падставе мультыэтнічнасьці і канфэсійнай плюралістычнасьці Родэвальд адносіць Полацак XVIII ст. несумненна да гарадоў Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы. Аўтар сам адзначае, што для параўнаньня матэрыялу ён выкарыстоўваў польскія гарады Каліш і Плоцк.

Час новага эканамічнага росквіту, паводле швайцарскага дасьледчыка, наступіў для Полацку толькі ў другой палове XIX ст. праз будаўніцтва чыгункі да Рыгі і пашырэньне навігацыі на Дзьвіне. Ад пачатку знаходжаньня ў складзе Расеі інтэграцыя ў царскую імпэрыю выяўлялася, найперш, у канфэсійнай палітыцы — езуіты мусілі згарнуць сваю дзейнасьць, а Берасьцейская унія была ліквідаваная. Цяпер жа большасьць насельніцтва гораду былі габрэямі. Праўда, пануючы ў эканоміцы Полацку, палітычна яны былі дыскрымінаваныя. Гэты аспэкт і, адпаведна, «нацыяналізацыю» гарадзкіх канфліктаў аўтар падае на базе аналізу гарадзкога права і выбараў гарадзкой управы. Самакіраваньне ж пачатку XX ст. ужо не было скіраванае супраць габрэяў і каталікоў. А палітыка гарадзкіх вярхоў, на думку Родэвальда, ураўнаважвала розныя сацыяльныя інтарэсы жыхароў Полацку. І зноў-такі Полацак, зь яго складанай этнаканфэсійнай структурай, не зьяўляецца для аўтара тыповым расейскім правінцыйным цэнтрам. Нават калі папярэднія сацыяльныя інстытуты падаюцца рудымэнтнымі, Штэфан Родэвальд усё ж гаворыць пра Полацак да 1914 г. як пра горад Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы. Гэтым самым як быццам пераадольваецца цывілізацыйная манаполія Расейскай імпэрыі, а за ўніфікаваным фасадам рэглямэнтаванага дзяржаўнага мэханізму праглядаецца мазаіка розных культур. Вынікае, што і за расейскім панаваньнем у канцы XVIII — пачатку XX стст. Полацак і Беларусь не пакінулі сваёй цывілізацыйна-культурнай прасторы. Пры гэтым, адзначым, швайцарскі дасьледчык зусім далёкі ад поглядаў на расейскі пэрыяд гісторыі Полацку як на рэгрэс — аўтар аддае належнае эканамічнаму разьвіцьцю гораду, пачынаючы з другой паловы XIX ст., і палітыцы лібэралізацыі ў пачатку XX ст.

Усё ж для мяне напачатку існавала пытаньне, чаму прадметам свайго дасьледаваньня аўтар абраў менавіта Полацак? Бо для ілюстрацыі поліканфэсійнасьці і мультыкультурнасьці ў Беларусі ёсьць і больш яскравыя прыклады — унікальная для ўсходнеславянскага Сярэднявечча Горадня, якая ў XVIII ст. стала вельмі адметным палітычным і культурным цэнтрам, ці старажытны Менск, нахай на пачатку ўсяго толькі парубежны замак Полацкага княства, але вельмі сымпатычны ваяводзкі цэнтар XVI—XVIII стст., да таго ж губэрнскі, у адрозьненьне ад павятовага Полацку, горад за часамі Расейскай імпэрыі. Але ўсё ж Полацак дае — ужо толькі паводле фармальных прыкметаў — неацэнныя магчымасьці для скразнога дасьледаваньня: яго гісторыя пачынаецца з IX ст., з «варaскіх» часоў. І гэта гарадзкі цэнтар менавіта гістарычнай Беларусі — Белай Русі, назва якой пасьля ўсіх міграцыяў замацавалася за ўсёй нашай краінай. Да таго ж, як адзначыў нямецкі рэцэнзэнт кнігі Родэвальда Райк Айнакс, Полацак меў свой уласны стыль, які ўжо незваротна зьнік.



**Rohdewald, Stefan. Vom Polocker Venedig. Kollektives Handeln sozialer Gruppen einer Stadt zwischen Ost- und Mitteleuropa (Mittelalter, frьhe Neuzeit, 19. Jh. bis 1914).** — Stuttgart: Franz Steiner Verlag, 2005. 604 S. (Quellen und Studien zur Geschichte des цstlichen Europa. Bd. 70). ISBN: 3−515−08696−X

(**Родэвальд, Штэфан. Аб Полацкай Вэнэцыі: Калектыўныя дзеяньні сацыяльных групаў гораду паміж Усходняй і Цэнтральнай Эўропай (Сярэднявечча, раньні Новы час, XIX ст. да 1914 г.).** — Штутгарт: «Франц Штайнэр», 2005. 604 с. (Крыніцы і штудыі па гісторыі Ўсходу Эўропы. Т. 70)).

# Грамадзянін Вялікага Княства

Здараецца, што няма каму ўзгадаць героя, бо ён самотны і гіне апошнім. Пра **Ігнацыя Някляўза** пішуць **Мікола і Ўсевалад Сьцебуракі.**

Гісторыя — гэта, найперш, імёны. Вяртаньне зь небыцьця некаторых зь іх становіцца знакавай падзеяй у гісторыі цэлага народу. Але гэта зрэдку, часьцей вяртаньне імя — проста наданьне належнай павагі мінуламу і яшчэ адзін радок у хроніку жыцьця краіны...

Ёсьць імёны герояў, якія памятаюць сябры і паплечнікі, такія імёны натхняюць тых, хто працягвае справу, іх большасьць, і за імі — слава. Але здараецца, што няма каму ўзгадаць героя, бо ён самотны і гіне апошнім. Толькі і тады імя яго не забываецца, бо імёны такіх змагароў з маўклівай павагай памятаюць праціўнікі. Такіх імёнаў няшмат. За імі — гонар. Менавіта такое імя, узгаданае на старонках афіцыйных клерыкальных праваслаўных «Литовских епархиальных ведомостей» за 1883 г., прыцягнула нашую ўвагу.

У нумары, дзе грунтоўна разглядаецца тэма ліквідацыі Берасьцейскай уніі, сярод іншых матэрыялаў падаецца, перадрукаваны з дазволу цэнзуры, матэрыял Кіеўскіх япархіяльных ведамасьцяў — нэкралёг па Ігнацыю Някляўзу.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Ігнацi Някляўз (Неклаузъ) быў уніяцкім сьвятаром з ордэну базыльянаў, чалавекам, які ня здрадзіў сваёй веры і да апошніх дзён жыцьця быў непахісным прыхільнікам уніі і грамадзянінам Княства Літоўскага.

Нарадзіўся ён у Курляндыі (землі якой знаходзіліся ў складзе ВКЛ). Дакладная дата ягонага нараджэньня невядомая, але з уласных словаў сьвятара і датаваньня пэўных падзей, можна меркаваць, што яна адносіцца да 90-х XVIII ст.

Пра дзяцінства ягонае вядома толькі тое, што пачатковую адукацыю ён атрымаў на радзіме. Тым часам разгортваліся трагічныя для краіны падзеі — захлынулася крывёй паўстаньне Касьцюшкі і быў зацьверджаны апошні падзел Рэчы Паспалітай, былое Княства незваротна ўлівалася ў склад імпэрыі...

У сьвядомым узросьце ён бачыў на свае вочы падзеі расейска-францускай вайны 1812 г., што пракацілася ў два бакі па колішнім Княстве. Таксама Някляўз добра памятаў шмат дробных дэталяў з эпохі цараваньня імпэратара Аляксандра I — час, на які прыпалі новыя выпрабаваньні краю.

Ужо ў сталым веку Ігнацi Някляўз атрымліваў багаслоўскую адукацыю ў Віленскім унівэрсытэце. Набытыя веды былі неаспрэчна грунтоўнымі: ён валодаў амаль дзясяткам моваў (царкоўнаславянскай, лацінай, габрэйскай, нямецкай, расейскай, польскай, французскай...). Дарэчы, слынны ўнівэрсытэт Някляўз так і ня скончыў. Але ня зь нейкіх асабістых прычынаў, а праз ліквідацыю апошняга, пасьля паўстаньня 1830—31 гг., калі былыя жыхары Княства ў чарговы раз супольна з палякамі паспрабавалі вырвацца з-пад прыгнёту Расеі...

Пасьля закрыцьця ўнівэрсытэту Ігнацi Някляўз, стаўшы сьвятаром, дзесяць гадоў служыў у Жыровіцкім базыльянскім кляштары, дзе, маючы адметны прамоўніцкі талент, выконваў абавязкі прапаведніка.

Пра ягоны востры розум, трапнае слова і дзёрзкі адкрыты характар сьведчыць адзін цікавы выпадак. Аднойчы падчас казані айцец Ігнацi заўважыў, як заможны пан абапёрся на бакавы прастол. Сьвятар гучна прамовіў, указваючы на магната: «У старажытных ізраільцянаў казлоў спачатку забівалі, а пасьля ўскладалі на алтар у ахвяру Богу, а цяпер казлы жывыя самі лезуць на прастол!» Неабачлівы шляхціц яшчэ доўга ня меў праходу ад кпінаў.

Прамоўніцкія здольнасьці і імпэт, як адзначалі сучасьнікі, засталіся з Ігнацием Някляўзам да глыбокае старасьці. Са сьведчаньняў аўтара нэкралёгу, прыходзкага сьвятара Антонія Ляўіцкага, Някляўз, маючы амаль стогадовы ўзрост, з ранейшым натхненьнем цытаваў па памяці свае колішнія палымяныя казані.

Але і Жыровіцкі кляштар ня стаў надзейным прытулкам айцу Ігнацыю — новая хваля русіфікацыі пасьля задушэньня паўстаньня дакацілася і да яго муроў. Прайшлі ганебныя разборы шляхты, урадам было адменена дзеяньне старажытнага сымбалю самастойнасьці — Статуту, скасоўвалася нацыянальная канфэсія — уніяцтва... У справаводзтве зацьвярджаецца тэрмін «Паўночна-Заходні край». Жыровіцкі ўніяцкі манастыр робіцца праваслаўным.

Менавіта ў гэты час айцец Ігнацi, нягледзячы на прапановы, спробы пераканаць і нават пагрозы, так і не прымае праваслаў'я. Непахісны ў сваіх перакананьнях, Ігнацi Някляўз застаўся да канца жыцьця ў сваёй, скасаванай, веры. Ён не баіцца пярэчыць самому мітрапаліту Ёсіфу Сямашку. Ня выключана, што менавіта праз дыспуты зь мітрапалітам ён ускладніў сабе далейшае жыцьцё. Так ці інакш, але месца яму ў Паўночна-Заходнім краі не знаходзіцца...

Ён знаходзіць прытулак пры рымска-каталіцкім касьцёле ва Ўкраіне, у мястэчку Белая Царква. Ня маючы больш магчымасьці ажыцьцяўляць душпастырскую дзейнасьць і шукаючы, як зарабіць на хлеб, ён — ужо ў сталым веку — ідзе на цывільную службу: уладкоўваецца касірам на Сьцеблеўскую суконную фабрыку, дзе і працуе да 1865 г. Былы сьвятар і манах адрозьніваўся выключнай сумленнасьцю, за што ўладальнік фабрыкі паклаў яму пажыцьцёвую пэнсію 90 рублёў у год.

Апошнія дванаццаць гадоў жыцьця стары пражыў у тамтэйшых сялянаў Мікіты Фаменкі і Пізьнюра. Знаходзячыся ў нястачы, ён адрозьніваўся жыцьцярадаснасьцю, дабрынёй, сьветлым розумам. Сьведкі ягоных апошніх гадоў адзначалі, што на твары старога заўсёды была шчырая ласкавая ўсьмешка, ён быў цьвярозым, выключна прыстойным і фанатычна набожным да скону. Да апошніх дзён жыцьця яго можна было пабачыць у храме, дзе ён шчыра маліўся...

Пры канцы карэспандэнцыі сьвятар Лявіцкі суха дадае: Ігнацi Някляўз пахаваны на рымска-каталіцкіх могілках гораду Сьцеблеў пад Кіевам.

Так, у звычайным некралёгу на паўстаронкі, адлюстраваны жыцьцёвы шлях асобы, якая засталася непахіснай у сваёй веры і да апошніх дзён зямнога жыцьця заставалася прыкладам чалавечай годнасьці.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

### Манаграфічныя выданьні па гісторыі Беларусі

**Бразгуноў А. Перакладная белетрыстыка Беларусі XV—XVII ст. / Навук. Рэд. В. Чамярыцкі. Менск: Беларуская навука, 2007. 302 с.**

Вось якія папулярныя жанры старабеларускай перакладной літаратуры дасьледуе аўтар — рыцарскія раман і навэля, гістарычны раман і аповесьць. «Трышчан», «Александрыя», «Атыла», «Рымскія дзеі» і інш. разглядаюцца ў супастаўленьні зь іх эўрапейскімі крыніцамі. Сьвецкія гістарычны і рыцарскі перакладныя раманы «ўраўнаважылі» ў прыгожым пісьменстве Беларусі XV—XV стст. шырокую плынь літаратуры рэлігійнага зьместу.

**Дук Дз. Полацак XVI—XVIII ст.: Нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыцьцёвай прасторы насельніцтва беларускага гораду. Наваполацак: ПДУ, 2007. 268 с.: іл.**

Абгрунтоўваючы абраны храналягічны пэрыяд сваёй працы, аўтар канстатуе: «Раньні Новы час зьяўляецца пераломным у палітычным, эканамічным і, як наступства, культурным жыцьці гораду. Менавіта ў гэты пэрыяд Полацак з квітнеючага і самага вялікага пасьля Вільні гораду Вялікага Княства Літоўскага, сталіцы намесьніцтва і ваяводзтва, пераўтварыўся ў павятовы горад у складзе Расейскае імпэрыі».

**CD: The 5th International International Conference «History and Archeology of Polotsk and Polotsk Land». Polotsk National Historical Cultural Muzeum-Reserve, 2007.**

[V Міжнародная канфэрэнцыя «Гісторыя і археалёгія Полацку і Полацкай зямлі». Полацкі нацыянальны гісторыка-культурны музэй-запаведнік, 2007.]

Кампакт-дыск, які выйшаў напярэдадні V Міжнароднай канфэрэнцыі, утрымлівае электронныя копіі зборнікаў папярэдніх чатырох канфэрэнцыяў 1987, 1992, 1997 і 2002 г. Добрая дапамога для спэцыялістаў. На дыску таксама зьмешчанае слайд-шоў пра Полацак. Інтэрфэйс у трох мовах — беларускай, расейскай, ангельскай. Хоць вокладка выкананая ў ангельскай мове.

**Марзалюк, І. Этнічны і канфэсійны сьвет беларускага гораду XVI—XVIII ст. (Этнаканфэсійны склад насельніцтва, этнічныя і канфэсійныя стэрэатыпы беларускіх гараджан). Магілёў: МДУ імя А. Куляшова, 2007. 164 с.**

Новая праца магілёўскага гісторыка і археоляга стала працягам ягонай папярэдняй кнігі «Людзі даўняй Беларусі: Этнаканфэсійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X—XVII ст.)» (Магілёў, 2003), якая выклікала немалы розгалас сярод гісторыкаў. Свой аналіз мэнтальнай адметнасьці гарадзкой цывілізацыі аўтар праводзіць асобна для двух гістарычных рэгіёнаў даўняе Беларусі — Літвы і Русі. Дыскусіі тае эпохі працягваюцца і сёньня.

**Алег Дзярновіч**

# Дзень вызваленьня

Штогод 3 ліпеня, на Дзень вызваленьня Беларусі, дзед Антон езьдзіў на сустрэчу былых партызанаў брыгады «Сьмерць фашызму». Піша **Алесь Аркуш**.

Сустрэча ладзілася ў вёсцы Юрава (мясцовыя жыхары называюць вёску менавіта так, а ня Юр’ева) побач з брацкай магілай загінулых у Другой сусьветнай вайне. На магіле ўсталявалі помнік: салдат са схіленым у жалобе сьцягам. Звычайна дзеда адвозіў на сваёй машыне мой бацька, які за кампанію браў і мяне. Такім чынам, езьдзілі мы ўтрох: я, бацька і дзед.

Прыбыўшы на месца, дзед Антон папярэджваў нас, што доўга не забавіцца, каб мы яго пачакалі.

3 ліпеня ў Юраве было мнагалюдна, як у вялікім горадзе. Грала музыка, лунালі сьцягі, працаваў выязны гандаль, праз кожныя дзесяць мэтраў дыміліся паходныя мангалы, дурманячы пахам смажанага мяса. Сьвята пачыналася мітынгам ля помніка — урачыстымі прамовамі былых камандзіраў, піянэрскімі салютамі і гукамі горнаў. Пасьля ўрачыстай часткі ўдзельнікі сустрэчы дзяліліся на групы — па колькасьці атрадаў, зь якіх складалася брыгада «Сьмерць фашызму». Кожны атрад адзначаў Дзень вызваленьня асобна. Выглядала, што для тутэйшых партызанаў 3 Ліпеня было большым сьвятам за 9 Траўня, Дзень перамогі. Беларусь ня шмат мела ўласных сьвятаў. Бадай што толькі адно. Скончалася ўсё тым, што партызанаў шукалі і зьбіралі па ўсім навакольлі. Вясковыя кабеты зь Юрава і суседніх вёсак звычайна даручалі гэта сваім дзецям або ўнукам, якія павінны былі пільнаваць пераможцаў.

Былыя народныя мсьціўцы любілі зьбірацца на гэтае сьвята ня толькі праз дармовую гарэлку. Тут нярэдка вырашаліся прыватныя праблемы, бо рэспублікай на той час працягвалі кіраваць партызанскія камандзіры. У Дзень вызваленьня ў Юраве заўжды было каму паскардзіцца на несправядлівасьць. Начальнікі прыяжджалі нават з Масквы. Кагосьці абдзялілі кватэрай, нехта пазбавіўся пасады, камусьці несправядліва прызначылі пэнсію. Баявога таварыша нельга было пакідаць у бядзе.

Антон Іванавіч сапраўды ня бавіўся. Перакідваў чарку-другую, сьвятая справа, але ніколі не вяртаўся ў Жодзіна п’яным. Такога я ня помню. Як правіла, ён не заставаўся на атрадныя пагулянкі ў вузкім коле. Падобна, ён ня меў партызанскіх сяброў. Ня помню таксама, каб ён нешта апавядаў па дарозе, калі мы адвозілі яго дахаты.

Тады я не зьвяртаў на гэта ўвагі, балазе тыя дзьве—тры гадзіны да чорцікаў надакучала яго чакаць, дый ня мог тое зразумець дзіцячым розумам. Дарэчы, якраз у тыя гады, у пэрыяд моцнай партызанскай улады ў Беларусі, дзед Антон пазбавіўся сваёй пасады — начальніка жодзінскай чыгуначнай станцыі. Гады ўжо былі ня тыя, дый ня меў адпаведнай адукацыі. Далей ён працаваў сьціплым дзяжурным па вакзале. Ня думаю, што ён каму-небудзь скардзіўся з тае нагоды.

У Жодзіне Антон Іванавіч апынуўся ў 1938-м, перавялі са станцыі Слаўнае, што на Талачыншчыне. У той год амаль увесь склад жодзінскіх чыгуначнікаў быў арыштаваны і людзі асуджаныя як шкоднікі і ворагі народу. На вызваленыя працоўныя месцы сьцягвалі спэцыялістаў зь іншых мясьцінаў. Антону Іванавічу ішоў 27-ы год, меў сям’ю, дзяцей. Мой бацька ў сям’і быў старэйшы, яго прывезьлі ў Жодзіна ў двухгадовым узросьце. Антона са Слаўнага прызначылі начальнікам станцыі. Магчыма, усіх астатніх работнікаў проста набралі з навакольных вёсак.

Калі пачалася вайна, у сям’і Антона Іванавіча было ўжо чацьвёра дзяцей: Барыс, Люба, Тамара і Толя. Вялікая сям’я. Пра эвакуацыю ў глыбіню краіны не магло быць і размовы, чыгуначнікі павінны заставацца на працоўным месцы да апошняга эшалёну. На восьмы дзень вайны ў Жодзіне ўжо былі немцы.

Чыгуначнікі былі патрэбныя і новай уладзе — усім было загадана выйсьці на працоўныя месцы. Ясна, што Антон Іванавіч ня мог рызыкаваць сям’ёй. Чыгуначнікі вымушаныя былі падпарадкавацца.

Пасьля таго, як у ваколіцах Жодзіна паўстаў партызанскі рух, а была гэта тэрыторыя дзейнасьці брыгады «Сьмерць фашызму», партызаны хутка наладзілі сувязь з працаўнікамі чыгункі. Відавочна, недзе ў 1943 годзе і мой дзед стаў «агентам» партызанкі.

Антон Іванавіч любіў зьбіраць грыбы. Быў вялікім аматарам, і яму заўжды шчасьціла. Часам браў з сабой старэйшага сына. У лесе, як згадвае мой бацька, ён сустракаўся зь нейкімі невядомымі людзьмі, вёў зь імі працяглыя гутаркі. Трэба меркаваць, гэта і былі партызаны. У жніўні 1943 году адзін зь нямецкіх спэцыялістаў, паляк на прозьвішча Шваб, папярэдзіў Антона Іванавіча пра плянаваныя арышты сярод жодзінскіх чыгуначнікаў. Дзед Антон, не марудзячы, у тую ж самую ноч пасадзіў сям’ю на падводу і накіраваўся ў лес, у партызанскую зону. Прытулак знайшлі ў сям’і Невяровічаў зь вёскі Чэмкі, гэта за некалькі кілямэтраў ад славутага старажытнага Юрава. Дарэчы, зь Юрава паходзіў вядомы беларускі археоляг Аляксандар Ляўданскі, які патрапіў пад рэпрэсіі і быў расстраляны ў «напалмавым» для беларускай інтэлігенцыі 1937-м. Сам Антон Іванавіч падаўся ў партызаны. Аднак узьнікла праблема: у народныя мсьціўцы прымалі толькі тых, хто меў зброю, яе трэба было прыстарацца самастойна. У Чэмках чыгуначніку падказалі, што вінтоўку можна знайсьці на дне рачулкі Цна, якая працякала побач зь вёскай. Іх туды паўкідалі ў 1941-м савецкія акружэнцы. Антон Іванавіч тыдзень шукаў зброю, нырaў і абмацваў дно рачулкі. Вяскоўцы не падманулі, вінтоўка знайшлася. Чыгуначніка прынялі ў атрад імя Чкалава.

Цікава, што ў гэтым жа атрадзе быў і пісьменьнік Іван Сіняўскі. Яго прынялі ў «чкалаўцы» таксама ў 1943 годзе. Не маглі яны ня быць знаёмымі, а можа нават і хадзілі разам на заданьні. Неяк тут адразу згадваюцца творы Васіля Быкава. Дарэчы, зь Сіняўскім здарылася абсалютна быкаўская гісторыя. На адным з заданьняў будучы пісьменьнік з таварышамі патрапіў у засаду. Пачаўся бой. Сілы былі няроўныя. Партызаны пачалі адыходзіць ад дарогі, на якой меркавалі закласьці міны. Адзін з падрыўнікоў, Сяргей Кавалеўскі, загаўроніўся. Меў яшчэ магчымасьць адысьці пад прыкрыцьцём байцоў групы, але ня стаў гэтага рабіць. Калі немцы атачылі «ляснога бандыта», наваколле скалануў выбух — разам з партызанам загінулі ворагі. Усё гэта адбылося на вачах у Сіняўскага. Пасьля вайны пісьменьнік хадайнічаў у розныя інстанцыі, каб подзьвіг таварыша быў пасьмяротна адзначаны, але так і не дамогся справядлівасьці. Адзінае што зрабіў у памяць: напісаў пра яго нарыс.

Цікава, ці хадзіў Сіняўскі на заданьні з маім дзедам Антонам? Ці выпіваў разам на вызваленчых сустрэчах у Юраве? А дарма не таварышаваў, бо атрымаў бы цудоўныя сюжэты для твораў. Я пачуў гэтыя гісторыі ад майго бацькі. Найбольш мне падабаецца сага ўратаваньня.

Адбылося гэта ў 1944 годзе падчас самай моцнай блякады партызанскай зоны. Немцы кінулі на барацьбу зь «ляснымі бандытамі» вялікія армейскія сілы. Некалькі партызанскіх атрадаў, ня толькі з брыгады «Сьмерць фашызму», трапілі ў кацёл у раёне возера Палік. Партызаны і мірнае насельніцтва, якое жыло ў лесе пад апекай лясных змагароў, былі загнаныя ў гразкія балоты. Партызаны пайшлі на штурм аднаго з участкаў нямецкага ачапленьня, прарваліся і расьсеяліся па лесе, каб затым сабрацца ў прызначаным месцы. Немцы пачалі шчыльна прачэсваць усё наваколле. Адзін з такіх нямецкіх ланцугоў прыціснуў дзеда Антона да берага вадаёму. Кемлівы партызан прыняў рашэньне: ён выразаў чарацінку, нырнуў у ваду і закамуфляваўся водарасьцямі і цінай. Неўзабаве немцы выйшлі на той самы бераг. У вадзе хтосьці зь іх заўважыў шапку дзеда. Яны пачалі торкаць штыхамі, дасталі шапку, паўглядаліся, пастаялі, пачакалі, адзін зь іх справіў малую патрэбу ў ваду побач зь дзедам. І сышлі. Уяўляю тую радасьць, калі дзед вынырнуў з вады з чарацінкай у зубах і пабачыў, што немцаў няма. Як у якім вэстэрне. Жыцьцё бывае круцейшым за любое кіно.

У той самы час у балоце сядзела і мая бабуля Ганна з чатырма малымі дзецьмі. Нямецкія ланцугі таксама праходзілі зусім побач. Былі чутныя воклічы, ляскат зброі, стрэлы. Самага малодшага Толю, які бесьперапынна плакаў і прасіў есьці, даводзілася тварам прыціскаць да моху.

Да 3 ліпеня было зусім недалёка. Два—тры тыдні. Але трэба было ўратавацца, выжыць, дачакацца вызваленьня.

*Беласток*

# Гісторык Сьмяховіч

> засталіся па-за ўвагай выдання.
>
> **Тэма 2.** “Беларуска-літоўская дзяржава Вялікае княства Літоўскае”.
>
> Назва тэмы не адпавядае прынцыпу гістарызма, таму што ў другой палове XIII – першай палове XVI стст. ніякай беларуска-літоўскай дзяржавы не існавала. У праграме тэма № 3 пазначана як “Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае (другая палова XIII – першая палова XVI стст.)”. Пункт № 1 тэмы 2 метадычных указанняў таксама не адпавядае праграме, дзе патрабуецца разглядаць “Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы фарміравання ВКЛ, уплыў знешніх фактараў на працэс утварэння Літоўскага княства, а не “погляды гісторыкаў на прычыны і працэс утварэння ВКЛ” як гэта робіцца ў выданні.
>
> **Тэма 3.** Як сведчыць аналіз, гэтая тэма адпавядае патрабаванням тэмы

У «НН» (№ 17’2006) быў зьмешчаны матэрыял Аркадзя Шанскага «Чоткі Чачоткін» пра дзіўную гісторыю з мэтадычкай для завочнікаў у Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі (г. Горкі). Як адзін з аўтараў гэтай мэтадычкі, хачу паведаміць пра ня менш дзіўны працяг гэтай гісторыі. Магчыма, гэта будзе цікава чытачам «НН», тым больш што тэкст мэтадычкі зьмешчаны на сайце Беларускай Інтэрнэт-Бібліятэкі «Камунікат».

Забараніўшы мэтадычку і сканфіскаваўшы яе наклад, прарэктар Чачоткін толькі праз год (!) прадставіў абяцаную разгромную рэцэнзію на нашае выданьне. Патрэбны рэцэнзэнт, урэшце, быў знойдзены ў Інстытуце гісторыі АН у асобе загадчыка аддзелу гісторыі беларускай дзяржаўнасьці М.Сьмяховіча.

Усяго таго ў мэтадычцы, што выклікала «ідэалягічны пярэпалах» у адміністрацыі БДСГА, рэцэнзэнты не заўважылі. Прысуд нашаму выданьню быў вынесены паводле сукупнасьці іншых заўвагаў.

Сур’ёзнае абвінавачваньне Сьмяховіч зьвязаў з нашымі памылковымі «тэарэтычна-мэтадалягічнымі падыходамі да тлумачэньня гісторыі Беларусі». Тут аўтараў мэтадычкі і ўсю гістарычную навуку чакала сэнсацыйнае «адкрыцьцё». І належыць яно галоўнаму, паводле пасады, у краіне дасьледчыку гісторыі беларускай дзяржаўнасьці. Высьвятляецца, «у другой палове XIII — першай палове XVI ст. ніякай беларуска-літоўскай дзяржавы не існавала». Не перадаць зьдзіўленьня, зь якім была ўспрынятая намі гэтая заява. Заявіў гэта не студэнт-завочнік ці гісторык-пачатковец, а кандыдат навук, які займаецца тэмай прафэсійна, кіруе адпаведным аддзелам у вышэйшай навуковай установе Беларусі! Выходзіць, Сьмяховічу невядома, што гісторыя ВКЛ як беларуска-літоўскай дзяржавы грунтоўна дасьледаваная ў сучаснай навуковай літаратуры, шырока асьветленая ў навучальных выданьнях і вывучаецца ва ўсіх тыпах навучальных установаў. Урэшце, тая ж тыпавая праграма, зь якой Сьмяховіч праводзіў параўнаньне нашай мэтадычкі, неаднаразова характарызуе ВКЛ як беларуска-літоўскую дзяржаву.

Пасьля гэтага ўжо не зьдзіўляла нязгода Сьмяховіча з палажэньнем дзейнай Канстытуцыі РБ пра «шматвяковую гісторыю беларускай дзяржаўнасьці», ягоная ўпэўненасьць у рэальным сувэрэнітэце савецкай Беларусі, яго неразуменьне характару і сутнасьці пераменаў, што адбываліся ў нацыянальна-культурным жыцьці Беларусі ў пачатку 1990-х. Падумалася толькі, мо гісторык-невук выпадкова трапіў у акадэмічную навуку. Але ўжо хутка я падзівіўся сваёй наіўнасьці. Сам дырэктар Інстытуту гісторыі А.Каваленя ў гутарцы па тэлефоне ў адказ на просьбу даць на мэтадычку аб’ектыўную рэцэнзію заявіў, што нічога дзіўнага ў рэцэнзіі Сьмяховіча ня бачыць («рэцэнзія як рэцэнзія») і што «трэба паглядзець яшчэ, што гэта была за дзяржава Вялікае Княства Літоўскае». Ну што тут скажаш? Толькі тое, што ўпоравень з бугальтарам (паводле адукацыі) Чачоткіным сталі дыплямаваныя гісторыкі на высокіх пасадах Сьмяховіч і Каваленя… Цяпер можна быць спакойным за лёс беларускай гістарычнай навукі.

**Валеры Шчэрбаў, Горкі**



**У Менску прайшоў першы ў гісторыі сталіцы парад нявестаў.**

## Дзірка ў законе: калекцыянаваць «фотаклубнічку» не забаронена

Генпракуратура правяла праверку паводле публікацыі ў СМІ зьвестак пра супрацоўніка фоталябараторыі, які калекцыянаваў фатаздымкі парнаграфічнага характару, якія знаходзіў на стужках заказчыкаў. Быў праведзены аналіз нарматыўных актаў, што рэгулююць дачыненьні ў сфэры паслугаў, у прыватнасьці, дзейнасьць фота- і кіналябараторыяў.

Ён засьведчыў, што несумленны супрацоўнік фоталябараторыі не панясе адказнасьці. Бо адказнасьць за такія дзеяньні не прадугледжаная законам.

Па выніках праверкі Генпракуратура накіравала ў Саўмін інфармацыю з прапановай разгледзець пытаньне пра дапаўненьне арт. 15 Правілаў побытавага абслугоўваньня спажыўцоў адпаведнай нормай. Адпаведна ёй выканаўца замовы павінен узгадняць з заказчыкам любое выкарыстаньне прадстаўленых ім асабістых фота- і відэаматэрыялаў. Гісторыя, якой зацікавілася пракуратура, зьвязаная з Горадняй. Прынамсі пра адзін такі выпадак у траўні гэтага году паведамляў гарадзенскі блог s13. Гісторыя выклікала розгалас сярод гарадзенскіх інтэрнаўтаў. І прыцягнула ўвагу пракуратуры.

## Паляваньне на адпачывальнікаў

У Гарадоцкім раёне маладая жанчына каталася з бацькамі на чаўне па штучным вадаёме. У гэты час у бок возера пачаў страляць са стрэльбы мужчына. Добра, што нікога не параніў.

Міліцыя ўстанавіла, што са стрэльбы страляў 35-гадовы прадпрымальнік. Хулігана затрымалі.

## Ля Інстытуту культуры адкапалі бомбу

7 ліпеня ў цэнтры сталіцы, па вуліцы Суражскай, недалёка ад прыпынку грамадзкага транспарту «Інстытут культуры», у зямлі быў знойдзены снарад часоў мінулай вайны. На месца адразу прыбылі сапёры з сабакамі. Знаходку вывезьлі зь месца падзей яшчэ да прыезду журналістаў.

## У Крыме патанула маладая гарадзенка

28-гадовая жыхарка Горадні патанула ў Чорным моры вечарам 5 ліпеня. Няшчасны выпадак здарыўся на дзікім пляжы ў бухце Караджынская. У гэты час на моры быў шторм 6—7 балаў. «Месца для купаньня прыстасаванае не было, самы блізкі ратавальны пост месьціўся на адлегласьці кілямэтра», — адзначылі ратавальнікі.

## У Буда-Кашалёўскім раёне падлетак застрэліў сябра

Трагедыя адбылася непадалёк Дняпра, на пашы. Вучань 10 клясы адной са школ Гомелю выпадкова застрэліў 18-гадовага хлопца, жыхара вёскі Чабатовічы Буда-Кашалёўскага раёну. Стрэл быў зроблены зь незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы. Яна была зараджаная, і падлетак націснуў на курок у той момант, калі зброя была накіраваная ў бок 18-гадовага хлопца. Той памёр на месцы.

## Найбольш кішэньнікаў на «Пушкінскай»

У менскім мэтро найчасьцей пасажыры цярпяць ад злодзеяў на станцыі «Пушкінская». З пачатку году там зафіксаваны 21 крадзеж. Таксама злодзеі нярэдка «адзначаюцца» на станцыях «Купалаўская», «Плошча Леніна» і «Інстытут культуры». Самымі бясьпечнымі выявіліся «Першамайская», «Маладзёжная» і «Парк Чалюскінцаў». А самай небясьпечнай была «Кастрычніцкая», пакуль яе не закрылі на рамонт.

## У Нясьвіжы гарэла ратуша

Пажар гасілі каля гадзіны. На месца здарэньня прыехала ўсё кіраўніцтва гораду. Нагадаем, што ў свой час у Нясьвіжы згарэў палац, пасьля чаго пачалася яго рэканструкцыя.

## У Беларусі зарэгістраваны першы аўтамабіль Ferrari

Гэта Ferrari F-430 2008 г.в. каштуе мінімум 170 тысячаў даляраў. Гэта не адзіны супэрдарагі аўтамабіль у краіне. Паводле зьвестак ДАІ, па дарогах Беларусі таксама езьдзяць два аўтамабілі маркі Maybach 2003 г.в. Чатыры жыхары краіны валодаюць Bentley, сем беларусаў маюць Maseratti.

## Абрамовіч пайшоў у адстаўку

Прэзыдэнт Расеі Дзьмітры Мядзьведзеў падпісаў указ пра датэрміновае спыненьне паўнамоцтваў губэрнатара Чукоцкай аўтаномнай акругі. Раман Абрамовіч сыходзіць паводле ўласнага жаданьня. Часовым выканаўцам абавязкаў губэрнатара Чукоцкай аўтаномнай акругі прызначаны Раман Копін. Раман Абрамовіч кіраваў Чукоткай са сьнежня 2000 г.

## Дзень нараджэньня беларускага сьвятлафора

Такое «сьвята» прыпадае на ліпень. Калі б менскія сьвятлафоры былі людзьмі, магчыма, у гэты дзень яны хадзілі б па вуліцах у ня вельмі цьвярозым стане й шчасьліва пераморгваліся сыгнальнымі колерамі.

1 ліпеня 1928 году — на цэнтральных вуліцах Менску ўсталяваныя першыя чатыры сьвятлафоры для рэгуляваньня дарожнага руху. Адмыслова распаўсюджаная аб'ява тлумачыла грамадзянам сэнс кожнага сьвятлафорнага колеру.

Паводле адных зьвестак, першы сьвятлафор быў усталяваны на цяперашняй вуліцы Маркса, паводле іншых — на скрыжаваньні Кірава і Бабруйскай альбо нават Леніна і Савецкай.

Першы ж у гісторыі сьвятлафор быў усталяваны 10 сьнежня 1868 году ў Лёндане перад будынкам Парляманту. Сьвятлафор вынайшаў Дж.П.Найт, які праектаваў чыгуначныя сэмафоры.

## Маркі з грыбамі

Мінсувязі ўвяло ў паштовае абарачэньне дзьве мастацкія паштовыя маркі з сэрыі «Грыбы ядомыя». На адной марцы выяўлены баравік, на іншай — лісічка. Маркі аформіў мастак Рыгор Доўбік.

## У Ленінградзкай вобласьці абрабавалі беларускіх турыстаў

Здарэньне адбылося ў вёсцы Кіпень Ламаносаўскага раёну. Невядомыя злодзеі абрабавалі аўтобус беларускіх турыстаў. Ля аўтобусу нараніцу знайшлі цела памочніка вартаўніка. Сам вартаўнік быў паранены, і яго ў цяжкім стане адвезьлі ў бальніцу.

## Арбітар году працаваў на матчы п'яным

Скандал разгарэўся пасьля матчу чэмпіянату Беларусі па футболе між «Віцебскам» і наваполацкім «Нафтанам». Арбітар матчу Сяргей Шмолік быў п'яны, паведамляе газэта «Прессбол». Стадыён ён змог пакінуць толькі пры дапамозе пэрсаналу.

Вынік наркалягічнай экспэртызы — 2,6 праміле алкаголю ў крыві. Шмолік паспрабаваў апраўдацца, што выпіў пасьля гульні, але накачацца за невялікі тэрмін да такіх лічбаў немагчыма.

Берасьцеец Сяргей Шмолік, апроч матчаў беларускага першынства абслугоўвае эўракубкі, матчы зборных. Летась Фэдэрацыяй футболу Шмолік быў прызнаны найлепшым айчынным судзьдзём году.

**Паводле: СП, ЗП, АТ, naviny.by, БелаПАН, «Звязда», Эўрарадыё**

# Капітан Танака ў лесе

Капітан Танака выправіўся ў лес.
Падкажы яму, што трэба пакласьці ў кошык.




## КАНЦЭРТЫ

**Басовішча**

**18 — 19 ліпеня** — Басовішча. Бяруць удзел IQ 48, Krama, Troica, Zet, Pomidor/OFF, Dick4Dick, Neuro Dubel (BY). Ладзіцца арганізаваны даезд ахвотных наведаць «Басовішча–2008» ад Кузьніцы Беластоцкай. Праезд будзе бясплатным. Каб забраніраваць месца ў «чартарным рэйсе» трэба даслаць свае кантактныя дадзеныя на адрас zasvabodu.hrodna@gmail.com. Да Кузьніцы Беластоцкай можна дабрацца цягніком з Горадні. **Адпраўленьні — у 3.40, 7.55, 10.05, 14.50, 19.47, 22.34.**

**Neuro Dubel**

**15 ліпеня ў «Графіці» (зав. Калініна, 16) а 20-й** — урачыстае сьвяткаваньне дня нараджэньня гурту Neuro Dubel

**Вялікі джазавы рынг**

**13 ліпеня ў Палацы Рэспублікі** — вялікі джазавы рынг з удзелам джаз–квартэту пад упраўленьнем піяністкі **Алы Данцыг** і джаз–квартэту пад упраўленьнем скрыпача **Уладзімера Міцэнкі. Пачатак а 19-й.** Квіткі: 30 000 — 40 000.

**Open Air «DOUBLE AIR»**

**19 ліпеня ў Сілічах** — Open Air «DOUBLE AIR». Цэнтральны танцпол — electro house — будзе знаходзіцца ў ангары. На спэцыяльным подыюме — VIP–зоны. А на вуліцы разьмесьціцца RnB–танцпол. **Пачатак а 22-й.** Уваход: ад 25 000. Т.: 229–90–39, 229–92–86.




## ВЫСТАВЫ

**Да стагодзьдзяў Азгура і Глебава**

**У Мастацкім музэі да 31 жніўня** працуе выстава «Даўжэй за век…», прысьвечаная 100–гадовым юбілеям вядомых беларускіх творцаў — Заіра Азгура, Сьцяпана Андруховіча, Анатоля Волкава, Аляксея Глебава, Міхаіла Даўгялы, Людвігі Зданоўскай, Яўгена Красоўскага…

**Партрэт на фоне**

**У арт-галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасьці, 43)** працуе фотавыстава Юліі Лейдзік «Партрэт на фоне». **Фінісаж адбудзецца 19 ліпеня а 18-й.**

**Выстава твораў бэрлінскіх мастакоў**

**У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасьці, 47) да 27 ліпеня** можна пабачыць выставу твораў бэрлінскіх мастакоў, прадстаўнікоў міжнароднага цэнтру мастацтваў Kunsthaus Tacheles, які дзейнічае ў Бэрліне.

**«Гуміарабік» Андрэя Васкрасенскага**

**Да 27 ліпеня ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва** працуе фотавыстава Андрэя Васкрасенскага «Гуміарабік». Гэта першая беларуская выстава ў тэхніцы гуміарабік.

**Злачынствы Вэрмахту**

**Да 20 ліпеня ў Музэі гісторыі і культуры Беларусі** ідзе дакумэнтальная выстава «З найбольшай жорсткасьцю… Злачынствы Вэрмахту ў Польшчы, верасень — кастрычнік 1939 г.».

**Творы Аляксандра Дзямідава**

**У мастацкай галерэі «Ла-Сандр-арт» (Раманаўская Слабада, 24) да 19 ліпеня** — пэрсанальная выстава Аляксандра Дзямідава, чые творы экспанаваліся таксама ў ЗША, Нямеччыне, Галяндыі, Францыі, Англіі, Бэльгіі, Літве і Расеі. Мастак стварае дзіўныя сьветы, дзе рэальнае і нерэальнае зьліваецца ў адно, а колеры і лініі перадаюць адчуваньне абароненасьці і любові.

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**11 (пт)** — «КІМ»
**12 (сб)** — «Слуга двух гаспадароў»
**13 (ндз)** — «Ідылія»
**14 (пн)** — «Вечар»
**15 (аўт)** — «Больш чым дождж»
**16 (ср), 17 (чц)** — «Дзеці Ванюшына»
**18 (пт)** — «Памінальная малітва»
**19 (сб)** — «Каханьне ў стылі барока»
**20 (ндз)** — «Таполевая завея»
*малая сцэна*
**14 (пн)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха»
**20 (ндз)** — «Апэльсінавае віно»

**Тэатар беларускай драматургіі**

**11 (пт)** — «Адэль»
**14 (пн)** — «Чорны квадрат»
**16 (ср)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**17 (чц)** — «Нязваны госьць»
**18 (пт)** — «Неба ў дыямэнтах»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Вальлі»

**Вальлі** (WALLE)

ЗША, 2008, каляровы, 103 хв.

**Рэжысёр:** Эндру Стэнтан

**Жанр:** Анімацыйная фантастычная камэдыя–мэлядрама

**Адзнака:** 8 (з 10)

Маленькі робат Вальлі спраўна працуе на Зямлі, якую людзі пераўтварылі ў агромністую сьметніцу. Неахайнікі пакінулі плянэту, якую цяпер ачышчаюць робаты. Кампанію Вальлі складае толькі вісклівы прусак, але герой ня вельмі сумуе. А калі на зямлю спусьціцца рабатэса Ева, якую прыслалі з сакрэтным заданьнем, нагоды для суму будзе яшчэ меней. Парачка робатаў мусіць даставіць на карабель зялёную расьліну — дый дапамагчы бесталковым людзям вярнуцца дадому…

Чарговая карціна студыі «Піксар» — гэта сьвята анімацыі. Героі ня проста выглядаюць як жывыя — гэта пацешныя істоты з сваім характарам, звычкамі і нягодамі, з сваёй душой. Кампутарная карцінка пазбаўленая ўсялякай машыннай штучнасьці, а сымпатычны Вальлі з агенткаю Евай выглядаюць рамантычнаю парачкай, якая любіць м'юзыклы, танчыць і зьдзяйсьняе пацешна–геройскія ўчынкі.

Вальлі зь вялізнымі вачыма — гэта шалёны робат з «Кароткага замыканьня» і Вудзі Ален у адным флаконе, палюбоўнік–недарэка з вогнетушыцелем; дасьціпны мужчына рабатэсінай мары, здольны дзеля каханай на ўсё. Ева — жанчына–вамп, агентка і Ліліян Гіш зь фіялетавым позіркам.

Кампанія гратэскна–прыдуркаватых машынак адцяняе зорную пару як мага эфэктней.

Эндру Стэнтан — аўтар «Гісторыі цацак» і «Ў пошуках Нэма» — як заўжды расквеціў гэтую выбітную стужку для ўсёй сям'і забаўнымі спасылкамі й сур'ёзнымі намёкамі.

Атлусьцелыя людзі на касьмічным караблі, якіх кормяць машыны («Новыя часы» дый антыўтопіі Гаксьлі). Шалёны двубой камандзіра й штурвала (прывітаньне «Касьмічнай Адысэі»). Карцінкі пад Ван Гога, Сэра і Рэнуара на фінальных надпісах. І чаплінаўскі дотык пры канцы стужкі.

У карціне амаль няма дыялёгаў. Гэта м'юзыкал — і гэта нямое кіно. Гэта плястыка жэстаў і масак. Гэта цуд адушаўленьня — і спраўная навука для людзей, якія страцілі сэрца.

**Андрэй Расінскі**

# Што вы рабілі ў ноч на чацьвёртага?

ЛЕВЫМ ВОКАМ

Хапун на прадмет дачыненьня да выбуху прымушае ўсіх цьвяроза мысьлячых людзей як мага хутчэй абзавесьціся салідным алібі. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

— Добры дзень, можна?

— Добры дзень.

— Я ад знаёмага, які ведае чалавека, кум сястры якога некалі сядзеў разам зь Вінцуком...

— Вінцук... Вінцук... А! Гэта такі ў акулярах, з БНФ! Мне пра яго расказваў сын суседа пляменьніцы майго цесьця. У яго была праблема — ня мог набыць плястыкавага пакету. Прадавачкі казалі: мы вам пакет прададзім, а вы яго гайкамі нафаршыруеце — і на «Славянскі базар». Вось вы нам спачатку алібі, што спалі ў ноч на чацьвёртага, а потым мы вам пакет... Ну, я яму за паўлітру збацаў паперачку, быццам мы разам на чацьвёртага ўсю ноч сьпявалі караоке пад Агурбаш. Суседзі зьнізу быццам нават мянтоў выклікалі.

— І што, паверылі?

— А то! Які чыноўнік не паверыць чалавеку, калі алібі яму выпісвае сам ляўрэат рэспубліканскага конкурсу камбайнёраў па зборы рапсу 1999-га году! Гэта ж вам ня жонка або сусед. Да такіх алібі даўно даверу няма. Наадварот. Скажуць — цю, дык ваш сведка-сусед дагэтуль не заплаціў за ўстаноўку жалезных дзьвярэй у пад'езьдзе. Нешта вы цямніце, грамадзянін, калі спасылаецеся на такіх тыпаў. А ці няма ў вас дома плястыкавых пакетаў? Ёсьць? Сябра АГП і яшчэ мае дома пакеты! Дык у вас жа на лобе напісана, што вы той самы, які, як піша «Саўбелія», хацеў нам «іспортіть празднік».

— М-да!

— Вінцук — гэта яшчэ што! Прыходзілі да мяне пяць маладых дэмакратаў. Кажуць — шыюць выбух. Алібі трэба. Напісаў ім за пляшку салідную цыдулку — усю ноч на чацьвёртага гуляў зь імі ў ачко на распрананьне. Замялі справу ўмэнт. Які чыноўнік ня дасьць веры чалавеку, калі алібі яму выпісвае сам ляўрэат рэспубліканскага конкурсу камбайнёраў па зборы рапсу 1999-га году!

— Ух ты!

— Вам, я так разумею, таксама алібі трэба.Толькі адразу папярэджваю: калі вы апазыцыянэр і вам трэба нейкія гайкі для рамонту набываць, я бяру за такое алібі не стандартныя 500 грам, а літруху. Тут простага алібі мала. Тут трэба дэталёва і падрабязна пісаць: я, ляўрэат рэспубліканскага конкурсу камбайнёраў па зборы рапсу 1999-га году, выпадкова ў ноч на чацьвёртага ліпеня аказаўся ў вашай кватэры і назіраў, як вы ў тую ноч з жонкай спалі ў ложку, з такой гадзіны да такой на правым баку, а з такой да такой — на левым.

— Ясна. Але ў мяне іншая справа — трэба алібі, што я быў на месцы выбуху.

— ?!

— Проста я кіраўнік Савету бясьпекі. Былы. Праз той выбух мяне з працы папёрлі. А зараз яшчэ думаюць адправіць у нейкае Лімпапо! Калі ў мяне будзе алібі, што я самы першы прыляцеў на месца здарэньня...

— М-да. Давайце так напішам: я, ляўрэат рэспубліканскага конкурсу камбайнёраў па зборы рапсу 1999-га году, як той самы чалавек, які 4 ліпеня «іспортіл празднік», сьведчу, што першым на месца выбуху прымчаў такі і такі. Дуйце па пляшку, пакуль я тут усё афармлю.

— А паверыць?

— Ну які чыноўнік не паверыць чалавеку, калі алібі яму выпісвае сам ляўрэат рэспубліканскага конкурсу камбайнёраў па зборы рапсу 1999-га году!

## КАЛІ Б...

**...кампанію «Мы — беларусы!» разумелі літаральна.**




— Падазрона, што нас так настойліва пераконваюць, што мы — беларусы. Можа, мы — нехта іншы? Можа, мы — нэгры на плантацыях?

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Новая кніга з сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва»




## Лёлік Ушкін. Левым вокам

Левым вокам: фэльетоны, гумарэскі, карыкатуры / Лёлік Ушкін. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. — 146 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»).

Лёлік Ушкін (Алег Новікаў) — адзін зь піянэраў беларускага анархісцкага руху, сузаснавальнік сатырычнага выданьня «Навінкі». Ад 2007 г. — старшыня Беларускай партыі Зялёных. Таксама ён калюмніст газэты «Наша Ніва» і сайту nn.by. У кнігу ўвайшлі ягоныя найлепшыя фэльетоны і малюнкі.

Прэзэнтацыя кнігі пройдзе 18 ліпеня (пятніца) на Ўправе БНФ (вул. Машэрава, 8). Пачатак а 18.00.

Шаноўныя чытачы!
Цана газэты ўздымаецца да 12 тысячаў на месяц. Тыя, хто ўжо заплаціў, атрымаюць яе па старой цане.

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,** дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

## Вялікі дзякуй

**Аляксандру М.** з Астравецкага раёну.
**В.Т., Уладзімеру Ш.** зь Віцебскага раёну.
**Міхаілу Г.** з Гомельскага раёну.
**Анатолю М., Андрэю М.** з Чашніцкага раёну.
**Людміле Р.** з Капыльскага раёну.
**Паўлу Л., Аляксандру П.** з Глыбоцкага раёну.
**Андрэю Ч.** з Карэліцкага раёну.
**Мікалаю Б.** зь Сьветлагорскага раёну.
**Пётру М., Тадэвушу Ш., Сьвятлане Ц.** з Маладэчанскага раёну.
**Уладзімеру Т.** са Жлобінскага раёну.
**Івану В., Раісе М., Лілії З.** зь Менскага раёну.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**З Амэрыкі.** Тутака ваююць з п'янствам гэтакім спосабам. Калі паліцыя спаткаець на вуліцы п'янага, дык зараз вядзець гэтага ягамосьця ў вучастак, дзе і зьнімаюць зь яго фатаграфію. На другі дзень паказваюць яму фатаграфію, кажучы, што яна будзе вывешана на вуліцы, калі яшчэ раз спаткаюць яго п'яным.

**«Наша Ніва». № 25. 1908**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 09.07.2008.
Замова № 3644.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.